ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 38-ы
№ 74 (2434)
19 верасня 1969 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

У ГОНАР ЗНАМЯНАЛЬНАЙ ДАТЫ

Трыццаць гадоў назад у жыцці савецкага народа адбыліся падзеі вялікага гістарычнага значэння. 17 верасня 1939 года, калі Еўропа была ўжо ахоплена полымем другой сусветнай вайны, развязанай гітлераўскай Германіяй, і джала фашысцкай агрэсіі нацэлілася на ўсход, савецкі народ працягнуў брацкую руку дапамогі працоўным Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, дапамог ім вызваліцца ад прыгнёту польскіх памешчыкаў і капіталістаў.

Гэтай знамянальнай даце быў прысвечаны ўрачысты сход прадстаўнікоў працоўных сталіцы рэспублікі—Мінска, які адбыўся ў дзень юбілею гістарычнай падзеі—17 верасня у канцэртнай зале філармоніі.

З дакладам выступіў першы намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР У. Е. Лабанок.

ДЗЕНЬ выдаўся на славу: ціхі, светлы. Такія дні часта бываюць у пачатку восені. На лясной паляне сабраліся па-святочнаму апранутыя калгаснікі сельгасарцелі імя Леніна Стаўбцоўскага раёна. Пачалося свята ўраджаю...

На імправізаваную трыбуну падымаліся лепшыя людзі калгаса: трактарысты, камбайнеры, шафёры, паляводы. Ім павязвалі цераз плячо ганаровыя чырвоныя стужкі ўдарнікаў ленінскай працоўнай вахты, уручалі падарункі, кветкі. Так, добра папрацавалі хлебаробы. Выканалі тры планы продажу збожжа дзяржаве, намнога раней тэрміну паселі азімыя, пачалі ўбіраць наш другі хлеб — бульбу. Карацей, добра ідуць справы ў калгасе.

Цэлы дзень вірыла весялосць на паляне. Звонкае лясное рэха далёка разносіла шырокія мелодыі народных песень, якія выканаў калгасны хор. Вельмі спадабаўся гледачам канцэрт самадзейных артыстаў. Свята ўраджаю вылілася ў сапраўднае народнае гулянне.

Фота М. МІХАЙЛАВА.

Верасень. Першы асенні месяц. На вуліцах, у скверах шамаціць пад нагамі сухі жоўты ліст. У тралейбусах, аўтобусах — паўнютка моладзі. Студэнты. Пачаліся заняткі. Вясёлкай успыхнулі пасумнелыя за лета афішныя стэнды. Восень — пара расстанняў, восень — пара сустрэч. Адкрыліся тэатры, цырк і зусім блізка ўжо адкрыццё сезону ў філармоніі.

Напярэдадні гэтай падзеі нашы карэспандэнты сустрэліся з кіраўнікамі буйнейшых беларускіх музычных, танцавальных, харавых калектываў.

Гутаркі з імі мы пачынаем публікаваць з гэтага нумара.

ЦУДОЎНАЯ КРАІНА МУЗЫКІ

Расказвае Віталій КАТАЕЎ,
заслужаны артыст БССР, галоўны дырыжор сімфанічнага аркестра

Сёлетні канцэртны сезон і радасны, і хвалюючы, і адказны — ён прысвячаецца стогадоваму юбілею з дня нараджэння У. І. Леніна. Да гэтай даты мы падрыхтавалі рад канцэртаў савецкай, зарубежнай і беларускай музыкі. У рэпертуар аркестра ўвойдуць і тыя творы, над якімі заваршаюць работу нашы кампазітары. Гэта сімфанічная паэма «Народ і правадыр» Мікалая Аладава, Маналогі для басу з сімфанічным аркестрам Генрыха Вагнера і Анатоля Багатырова. Мы чакаем таксама новых твораў ад Яўгена Глебава, Сяргея Картэса, Дзмітрыя Смольскага і іншых беларускіх кампазітараў.

Чым жа яшчэ парадуем мы слухачоў? Сярод цікавых твораў мне хочацца назваць Шостую сімфонію Чайкоўскага, Дзевятую Бетховена, якую наш аркестр выканае разам з Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлай, Патэтычную араторыю Свірыдава. У нашых канцэртах прагучаць Пракоф'еў і Рахманінаў, Равель і Брамс, Рыхард Вагнер і Рыхард Штраус.

У нашых задумках — Тыдзень сімфанічнай музыкі. Першы раз мы плануем правесці яго напярэдадні дня нараджэння правадыра, а потым хацелася б, каб такія тыдні сталі традыцыяй. На тыдні будуць выконвацца толькі новыя творы. Адбудуцца прэм'еры беларускай музыкі. Мы спадзяёмся, што ў гэтых канцэртах прымуць удзел музыканты з Масквы і Ленінграда, братніх рэспублік. А калі заглянуць яшчэ далей — дык мы хочам звярнуцца і да буйных мастакоў сацыялістычных краін. З некаторымі сучаснымі кампазітарамі ГДР, Польшчы, Югаславіі нашы слухачы ўжо знаёмы па канцэртах, прысвечаных музыцы гэтых краін. Думаю, што працяг знаёмства прынясе нямала радасці нашым слухачам. Калі нашы задумы здзейсняцца, а вельмі хацелася б гэтага, тыдзень можа стаць сапраўдным святам музыкі.

Летась мінчане і госці сталіцы пазнаёміліся з выдатным, я б сказаў, творам англійскага кампазітара Брытэна «Ваенны рэквіем». У гэтым сезоне мы хочам пазнаёміць слухачоў з араторыяй другога выдатнага майстра сучаснасці Анегера «Жана д'Арк на вогнішчы». У канцэрце прыме ўдзел Дзяржаўны акадэмічны хор Латвійскай ССР.

Мы вырашылі таксама звярнуцца да яшчэ малавядомага шырокаму слухачу кампазітара, прадстаўніка прагрэсіўнага кірунку ў музычным мастацтве Заходняй Германіі Паўля Хіндэміта. Сімфонія «Маціс — мастак», якую мы мяркуем падрыхтаваць — адна з самых папулярных сучасных сімфоній. Яна створана па матывах аднайменнай оперы кампазітара. Опера, напісаная буйным музыкантам-грамадзянінам, у якой гучаў гнеўны пратэст супраць фашызму, насілля над чалавекам, невыпадкова была забаронена ў Германіі ў 1934 годзе. Тады Хіндэміт «ператварае» оперу ў сімфонію. Змест яе, па сутнасці, застаецца той самы.

Мне здаецца, што тэма гэтая — адна з самых хвалюючых і сёння, калі на нашай маленькай планеце працягваюцца войны, а фашызм спрабуе падняць галаву.

Адной з галоўных праблем усякай канцэртнай дзейнасці былі і застаюцца пастаянныя клопаты аб новым слухачы. У сёлетнім канцэртным сезоне гэтай праблеме будзе ўдзелена асобая ўвага — моладзь вышэйшых навучальных устаноў і тэхнікумаў сталіцы мы пазнаёмім з лепшымі творамі сусветнай сімфанічнай класікі. Многія канцэрты будуць прысвечаны Уладзіміру Ільічу Леніну і суправаджацца лекцыямі. Назаву некалькі з гэтага вялікага цыкла: «Вобраз Леніна ў савецкай сімфанічнай музыцы». У канцэрце будуць выкананы «Дванаццатая сімфонія», Кантата і песні Дзмітрыя Шастаковіча. У канцэрце «Беларуская сімфанічная музыка» прагучыць гераічная паэма «Буравеснік» Яўгенія Цікоцкага, Другая сімфонія Анатоля Багатырова, творы Генрыха Вагнера, Мікалая Аладава, Пятра Падкавырава, Рыгора Пукста.

У гэтым годзе нашымі гасцямі будуць лаўрэаты Ленінскай прэміі Леанід Коган, Зара Далуханава, Эміль Гілельс — дарэчы, ён упершыню ў Мінску выканае ўсе пяць канцэртаў Бетховена. У нас пабываюць Ігар Бязродны, Рудольф Керэр, Віктар Траццякоў, Алена Абразцова, Дзмітрый Башкіраў, дырыжоры Неэме Ярві, Юрый Арановіч, Рудольф Баршай і іншыя. Нашым аркестрам прадырыжыруе Ёзэф Конта з Румыніі. Вялікім святам мне здаецца сёлетні прыезд да нас Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра СССР пад кіраўніцтвам дырыжора Яўгенія Святланава.

Аб усіх расказаць, вядома, цяжка. Мне толькі хочацца яшчэ сказаць некалькі слоў пра маладога, вельмі таленавітага піяніста з Масквы Алёшу Любімава, які прыедзе да нас упершыню.

Мы таксама мяркуем прыцягнуць для выступлення з аркестрам таленавітую моладзь з нашай кансерваторыі.

Па Беларусі, як і па ўсіх рэспубліках краіны, пройдзе фестываль музыкі народаў СССР, у якім мы таксама прымем удзел. А недзе ў красавіку, напярэдадні дня нараджэння Уладзіміра Ільіча мы дамо два канцэрты. Гэта будуць канцэрты-справаздачы. Справаздачы перад слухачамі, перад тымі, для каго мы працуем, каму прысвячаем сваю творчасць, парыванні, майстэрства.

Аркестр таксама прыме ўдзел у юбілейным пленуме кампазітараў, прысвечаным дзецям. На мой погляд — падзея вельмі сур'ёзная. Няма патрэбы гаварыць, што ад музычнага выхавання дзяцей, ад таго, як мы рыхтуем іх сёння слухаць і разумець музыку, залежыць, якою будзе наша заўтрашняя аўдыторыя. На пленуме мы выканаем творы Дзмітрыя Камінскага, Генрыха Вагнера, Алега Янчанкі і іншых.

І ў заключэнне мне б хацелася пажадаць, каб наша прэса глыбей і больш рознабакова асвятляла музычнае жыццё рэспублікі, не толькі выступала з рэцэнзіямі, але і аналізавала, прадстаўляла найбольш цікавыя і малавядомыя сачыненні.

Гэта будзе садзейнічаць павышэнню музычнай культуры самых шырокіх колаў насельніцтва, яго эстэтычнаму выхаванню.

Канцэртны сезон 1969—1970 гг. —сезон, калі будзе адзначацца вялікая дата—100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна, здаецца, будзе цікавым. Ва ўсякім разе, мы ўсё для гэтага зробім.

Падзеі. Факты. Навіны

ТЭАТР ПАЧАЎ СВОЙ СЕЗОН У ВЁСЦЫ

Незвычайна пачаўся сёлета сезон у Магілёўскім абласным драматычным тэатры. Будынак тэатра рамантуецца і творчы калектыў трыма групамі выехаў у раёны вобласці.

У калгасе імя Максіма Горкага Кіраўскага раёна была паказана інсцэніроўка рамана А. Кроніна «Замак Броўдзі». Калгаснікі сельгасарцелі імя Кірава Бялыніцкага раёна глядзелі ў сваім клубе камедыю М. Гіндзіна і Г. Рабкіна «Нічога не здарылася». Тэатр пабывае таксама ў Касцюковіцкім, Бабруйскім, Мсціслаўскім, Краснапольскім і іншых раёнах і выступіць са спектаклямі перад сельскімі гледачамі.

Адначасова ідзе работа над новымі спектаклямі. Заслужаны артыст БССР А. Раеўскі рэпеціруе п'есу С. Алёшына «Другая». Галоўны рэжысёр тэатра заслужаны дзеяч мастацтваў Марыйскай АССР Б. Валадарскі рыхтуе для юнага гледача п'есу-казку Л. Усцінава «Бочка мёду».

І. ТАРАСАЎ.

НА ПАЛЯВЫХ СТАНАХ, У СЕЛЬСКІХ КЛУБАХ

У гэтыя дні на Віцебшчыне да калгаснікаў, занятых на ўборцы ўраджаю, накіраваліся дзесяткі самадзейных мастацкіх калектываў абласнога цэнтра.

Працягваецца творчая справаздача канцэртнай брыгады Віцебскага раённага Дома культуры ў калгасах Гарадоцкага раёна. Цікавымі былі сустрэчы калгаснікаў Аршанскага раёна з танцорамі народнага ансамбля «Колас». Дзесяткі канцэртаў далі віцябляне ў дамах культуры, клубах, на палявых станах.

Паехалі на сяло і выязныя групы драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. Яны пакажуць свае лепшыя спектаклі.

В. ЗОРЫН.

ПЕСНЯРУ ЖЫЦЦЯ ПРЫСВЕЧАНЫ

Святочна ўбраная зала Мінскага Дома кіно. Днямі тут сабраліся беларускія кінематаграфісты, каб адзначыць 75-годдзе з дня нараджэння вялікага кінарэжысёра, пісьменніка, лаўрэата Ленінскай прэміі Аляксандра Даўжэнкі.

У фае арганізавана выстаўка, прысвечаная жыццю і дзейнасці А. Даўжэнкі. Сярод экспанатаў многа цікавых работ, якія дапаўняюць партрэт вялікага майстра.

Аб тым, як жыў і працаваў рэжысёр, аб яго лепшых фільмах, якія ўвайшлі ў скарбніцу сусветнага кінематографа, гаварыла ў сваім выступленні дацэнт Беларускага універсітэта Е. Бондарава.

У канцы вечара былі паказаны кінанарыс «Аляксандр Даўжэнка» і фрагменты з яго фільмаў.

Г. ПІК.

«ВЯЛІКАЕ ВАМ ДЗЯКУЙ...»

У літоўскім горадзе Шаўляі экспанавалася выстаўка работ вядомага беларускага графіка А. Тычыны.

Тысячы жыхароў горада пазнаёміліся з ілюстрацыямі да кніг, экслібрысамі і станковай графікай мастака. Удзячныя наведвальнікі пакінулі многа прыемных слоў у кнізе водгукаў. Вось адзін запіс: «Я як быццам пабываў на беларускай зямлі, дыхаў яе чыстым паветрам. Я ўлюбіўся ў родны край мастака. Вялікае Вам дзякуй! Арыс Зынкас (токар)».

З БЛАКНОТА ЖУРНАЛІСТА

У ДАРОЗЕ

АБРАЗОК

УКЛЕЦК я вяртаўся з калгаса гадзін у шэсць вечара. Мой аўтобус адыходзіў пасля сямі. Аднаму бавіць час не хацелася. Я пазваніў з аўтобуснай станцыі таварышу, які жыў недалёка і якога я даўнавата не бачыў.

— Адкуль ты ўзяўся? — узрадаваўся Міхась. — Зараз бягу.

Я выйшаў з душнага дыспетчарскага пакоя, у якім за дзень шафёры з усяго свету так накурылі, што не прадыхнуць. З шэрага, як дым у дыспетчарскай, неба сыпаўся дробны цёплы дожджык. Зямля даўно чакала яго — і цяпер прыціхла, разамлелая, задаволеная. Увачавідкі зелянелі пашарэлыя ад пылу дрэвы каля аўтобуснай і ўздоўж вуліц.

Пад дрэвам не так церушыла, і я схаваўся пад лісцяны парасон. На забрукаванай плошчы пукаціліся, як спіны чарапах, бліскучалі, прамытыя дажджом, каменні. На тым баку плошчы пад дрэвам збілася група людзей. Але доўга не маглі ўстояць: азваўся гармонік, глуха грымнуў бубен, зазвінелі талеркі — і над плошчай паплыў вальс. А пад дрэвам, дзе бялела сухое месцейка, і на ўчарнелым тратуары, пад дожджыкам, закружыліся пары.

— У армію хлопцаў праводзяць... — ціха сказала побач са мною пажылая жанчына і, памаўчаўшы, цяжка ўздыхнула: — Так і я свайго некалі праводзіла...

Яна зірнула ў мой бок выцвілымі, нібы з іх сышоў нябесны блакіт, вачыма, адвярнулася і заплакала.

Мне хацелася спытаць, каго праводзіла яна — мужа ці сына, але неяк няёмка было. Перапаўняе гора сэрца чалавека, і кожны нязначны напамінак расплёсквае яго. Дык ці трэба пытаць, лішні раз вярэдзіць раны?

Падышоў Міхась — вясёлы, бадзёры:

— Давай да мяне. Пасядзім, пагамонім.

— Не, — запярэчыў я. Чамусьці мне расхацелася ісці да яго. — Давай лепш паходзім тут, памаўчым разам...

— Сыпле ж... — кіўнуў ён на неба.

— Ліха з ім. Ды, здаецца, перастае ўжо.

Мы хадзілі сюд-туд міма музыкаў. Пад іх музыку танцавалі двое хлопцаў, стрыжаныя пад «нуль», і дзяўчаты, некалькі пажылых кабет. Дзявочыя туфлі так і распісвалі пясок высокімі абцасамі, так і мільгалі.

Міжволі запала ў вока адна пара — дзяўчына ў чырвонай кофце і чорнай плісіраванай спадніччы, сярэдняга росту, гнуткая ў стане. Танцавала яна лёгка, прыгожа, здавалася, не кранала зямлі стройнымі нагамі. Яны глядзелі адзін аднаму ў вочы — яна і высокі хлопец у чорным касцюме і белай нейлонавай кашулі. Глядзеліся і не гаварылі ні слова. Мусіць, позіркі былі больш красамоўныя, мусіць, часам словы бываюць лішнія. Для іх нічога не існавала, яны танцавалі так, быццам былі адны на цэлы бел-свет. Ён і яна. Ён і яна... І яшчэ вось гэтая тужлівая хвіліна расстанку...

— Ох і дзяўчына, — прашаптаў Міхась. — Такіх толькі ў Клецку і ўбачыш.

Было парна, зялёна і ціха, быў ласкавы дожджык-пылок — і глухія ўдары бубна, і залёты-«страданне» гармоніка, і з усіх людзей мне бачылася толькі гэтая страйнюткая прыгожая пара, якая нібы свяцілася хараством свайго кахання.

Аўтобус, на якім меліся ехаць прызыўнікі, прыбыў на пасадачную пляцоўку мінут на дзесяць раней, чым мой. І ўся кампанія паваліла да машыны. Нейкая бойкая кабета выраблядла нагамі выкрунтасы, спявала частушкі. «Рэзаў», на гармоніку, то ўскідваючы яго мо вышэй галавы, то прыкладаючы да мяхоў вуха, разудалы гарманіст.

Мужчыны, жанкі, хлопцы і дзяўчаты вялі іх, двух стрыжаных пад «нуль», Праўда, тыя ўжо сарамліва прыкрылі свае стрыжаныя галовы шапкамі, хоць бачна было, што даўно адвыклі ад гэтых галаўных убораў.

Абдымкі. Пацалункі. Старэнькая бабка не вытрымлівае, галосіць:

— А мой ты сакол-і-і...

Так, мусіць, галасілі недзе перад першай сусветнай вайной. Цяпер жа сіплы голас бабулькі здаўся такім недарэчным, што многія зарагаталі.

— Спазнілася, Іванаўна, на паўвека, — гукнуў нехта.

Бабулька жаласліва заміргала:

— Нават паплакаць не дадуць старому чалавеку.

А да прызыўнікоў дарваліся маладыя. Хлопцы трэслі рукі, ціскаліся ў абдымках, штурхаліся. Сыпаліся жарты, пажаданні:

— Вяртайцеся генераламі.

— Пісаць не лянуйцеся.

— Помніце пра Даманскі!

— За Валю не бойся — дагледзім!

А Валя, тая самая дзяўчына ў чырвонай кофце і чорнай спадніччы, яшчэ не развіталася са сваім, яшчэ не магла падступіцца да яго з-за хлопцаў. І толькі, калі шафёр гукнуў, што ад'язджае, яны рвануліся адно да аднаго. Валя абхапіла хлопца за шыю і насмелілася, сама пацалавала яго ў губы. І засаромелася, утуліла галаву ў плечы, адступіла ў натоўп. І толькі, калі крануўся аўтобус з месца, яна забегла наперад натоўпу, каб яшчэ раз махнуць рукою, убачыць любага.

Было яшчэ не позна, але неяк цемнавата — ад нізкага шэрага неба, ад дажджу, які зноў паціху зацерушыў, зашаптаў. Маўкліва стаялі праважаючыя, і плошча здалася мне сіратлівай, пустой.

— Ты не скажаш, нашто стрыгуць хлопцаў перад арміяй? — спытаў Міхась, — мо проста, каб не маўчаць.

— Традыцыя, мусіць.

— Традыцыя... — уздыхнуў Міхась. — І зусім, мне здаецца, не патрэбная. Час ужо не той. Зірні, якія хлопцы ідуць служыць — дзесяцікласнікі, культурныя...

Я не пярэчыў сябру, бо і сам, праўду кажучы, не раз адчуваў нейкі жаль, гледзячы на нязвыкла голыя хлапечыя галовы.

Тут і на мой аўтобус аб'явілі пасадку. Я развітаўся з Міхасём.

Зайшоў у аўтобус апошні і сесці не было дзе. Стаяў на прыступках каля задніх дзвярэй. Ехалі гэтым жа аўтобусам і тыя, хто праводзіў прызыўнікоў. Старэйшыя паселі недзе на пярэдніх месцах, а моладзь збілася ў канцы аўтобуса. Тут жа былі і музыкі.

Калі аўтобус мінуў украіну горада, гарманіст рыпнуў мяхамі. Быў ён невысокі, але, відаць, дужы. Светлыя валасы спадалі на лоб, твар шыракаваты, скуласты, кранутый вяснянкамі. Пальцы таўставатыя, моцныя, але бегалі па беленькіх гузіках увішна. Вось ён устрасануў галавой, адкінуў валасы, рвануў мяхі і заспяваў:

Ты сказала, што
ў аўторак
Пацалуеш разоў сорак.
Ты ж мяне падвяла:
Я прыйшоў — цябе няма.

Прыпеў падхапіла дзяўчына — не Валя, а другая, тая, што танцавала з другім навабранцам. Задзёрыста, трывожачы душу...

Я ж цябе падманула,
Я ж цябе падвяла,
Я ж цябе, маладога,
З ума-розуму звяла!

Гарманіст спяваў «Ты ж мяне...», а дзяўчына — «Я ж цябе...» Здаецца, ніколі не чуў я такога суладнага спявання, з такімі багатымі адценнямі пачуццяў — кожны пра сваё. «Ты ж мяне падманула», — скардзіўся хрыплым голасам гарманіст, быццам не верачы сам сабе: як магла ты, мая харошая, так паставіцца да мяне, парушыць слова, падмануць? Не, не веру ў твой падман, хоць і пакаштаваў яго горыч. «Я ж цябе падманула», — гарэзлівасць і ганарыстасць гучалі ў голасе дзяўчыны. Падманула цябе, любы мой, бо ўсё ва мне бунтуе супроць цішы ды гладзі, мне і цанкадаваць цябе хочацца, і пазабаўляцца, а яшчэ — цалаваць: не сорак, а мільён разоў! Падвяла, але шкадую, што так здарылася. Нам удваіх было б добра, а глядзі ж ты — як яно. І няўжо ты крыўдуеш на мяне?

Ён трос чубам над гармонікам, падмагаў, дацішкаў каленам мяхі да канца, нібы хацеў ускрыкнуць у адчаі і скрусе: «Эх, трын-трава! Дзе наша не прападала!»

Я зірнуў на Валю. Пунцавелі яе шчокі, вочы былі прыкрыты цёмнымі вейкамі. Яна, мусіць, не чула ўсяго, што рабілася вакол яе ў аўтобусе, яна, мусіць, усё яшчэ была са сваім высокім стрыжаным хлопцам, перажывала свой адважны, развітальны і мо першы ў жыцці пацалунак.

Эх, дзяўчына! Я разумею, як табе сёння цяжка. Можа ты не будзеш спаць усю гэтую ноч... Уткнешся ў гарачую падушку, абальеш яе пякучымі даявочымі слязьмі. Гэта тваё першае расстанне з любым. Але дай бог, каб не апошняе... Каб не стаяла і не плакала ты моўчкі такімі слязамі, як тая пажылая жанчына пад дрэвам. Тая жанчына, слёзы якой, здаецца, прапальвалі зямлю...

...Ты сказала, што ў суботу
Разам пойдзем на работу...—

вёў сваё гарманіст.

Валя закрыла далонямі твар. Плечы яе ўздрыгвалі...

Мікола ДЗЕЛЯНКОЎСКІ.

Перакліч сельскіх клубаў

КАЛІ АКТЫЎ АКТЫЎНЫ...

УЖО вечарэла, калі мы прыехалі ў вёску Апліса, што на Браслаўшчыне. На каромысле калодзежнага жураўля дагараў восеньскі дзень. У цэнтры вёскі мы знайшлі клуб. Знешне ён нічым не вылучаецца. Акуратны белы аднапавярховы дом. Палацам яго не назавеш. Але слава пра гэты асяродак культуры ідзе на ўвесь раён.

Заходзім. Невялікае фае, глядзельная зала. Адразу кідаюцца ў вочы маляўнічыя, з густам аформленыя стэнды, плакаты. На відным месцы стэнд, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. Побач памайстэрску зроблены мантаж «Жывём па ленінскіх запаветах», які расказвае аб поспехах калгаснікаў мясцовай арцелі імя Калініна. Ёсць тут і цікавыя дыяграмы, схемы.

Клуб не староніцца гаспадарчых спраў. Яго загадчык Браніслаў Кяпсня, актывісты не абмяжоўваюцца рэгістрацыяй поспехаў, а стараюцца ўздзейнічаць, уплываць на эканоміку. У дні веснавой сяўбы, жніва выпускалі баявыя лісткі, маланкі, сатырычныя плакаты. Так, тут умеюць славіць лепшых людзей. Але ўмеюць і высмеяць нядбайных работнікаў, аматараў заглянуць у чарку. Размалююць так, што хоць з хаты потым не паказвайся.

Каб лепш ахарактарызаваць работу клуба, звярнуся да лічбаў. Сёлета ў Аплісім клубе праведзена сем тэматычных вечароў, дзве сустрэчы з цікавымі людзьмі, шэсць вечароў моладзі, два вечары пытанняў і адказаў, амаль два дзесяткі канцэртаў і г. д. Здаецца, не так і мала. І большасць мерапрыемстваў былі цікавыя і змястоўныя.

Надоўга запомніцца тэматычны вечар «Вялікі, блізкі і родны». З хваляваннем слухалі калгаснікі голас правадыра, запісаны на пласцінцы. Горача выступалі і самі. Яны гаварылі аб вялікіх пераменах у жыцці, якія прынёс на беларускую зямлю Кастрычнік, аб светлай долі хлебароба. А потым — музыка, песні. Самадзейныя артысты падрыхтавалі канцэрт, у праграме якога былі любімыя творы Ільіча.

Нікога не пакінуў абыякавым тэматычны вечар «Сябры ўспамінаюць былыя паходы».

...Маляўніча ўпрыгожана сцэна. Між чырвоных сцягоў зззе ордэн Айчыннай вайны.

— Колькі гадкоў прайшло пасля вайны. Разараны акопы, траншэі. Але яшчэ і зараз у сне хаджу ў разведку. Бачу баявых сяброў... Тых, з якімі рэзаў дротавыя загароджы, хадзіў у атакі...

Цішыня панавала ў зале, калі выступалі былыя франтавікі В. Самахвалаў, І. Смерцеў, дырэктар мясцовай васьмігодкі Е. Міхайлава, старшыня праўлення калгаса П. Бялясаў. Пасля адбыўся вялікі канцэрт. Асабліва спадабаўся гледачам літаратурны мантаж «Іх імёны не забыты».

Доўга можна расказваць пра вечары ў вёсцы Апліса. Амаль кожны дзень у клубе праводзіцца нейкае мерапрыемства — то канферэнцыя чытачоў, то рэпетыцыя хору альбо музыкальнага ансамбля. Самадзейныя артысты, а іх тут больш паўсотні, нястомна шліфуюць сваё майстэрства. Летась яны выступалі на абласным агляндзе самадзейнага мастацтва ў Віцебску. Зараз рыхтуюцца да раённага конкурсу, прысвечанага 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. Усіх «сакрэтаў» раскрываць не буду, але скажу, што на конкурсе прагучаць у выкананні хору «Песня пра Леніна» самадзейнага кампазітара М. Зелянковіча, «Камуністы» І. Ронькіна і іншыя творы. Рыхтуюць новыя песні мясцовыя спевакі Яніна Аксён, Ганна Кірычэнка, Міхась Субота, пакажуць сваё майстэрства самадзейныя танцоры, аматары мастацкага чытання.

Хто ж кіруе ўсёй гэтай работай? Адзін загадчык клуба, якім бы універсалам ён ні быў, усяго не зробіць, усюды не паспее.

Браніслаў Кяпсня вопытны культработнік, студэнт-завочнік, дэпутат сельскага Савета, паважаны ў вёсцы чалавек. Ён здолеў згуртаваць вакол клуба актывістаў, знайшоў памочнікаў сярод інтэлігенцыі. Гэта настаўніцы Любоў Байдо, Паліна Скрабоўская, важак вясковай камсамоліі Валянціна Ануфрыева, гэта механізатары Фёдар Карашкоў, Леанід Худобка і шмат іншых энтузіястаў культуры.

Часяком прыходзіцца загадчыку клуба звяртацца за дапамогай, парадай да сакратара партыйнага бюро калгаса Аляксандра Кавалёнка, і ён заўсёды падтрымлівае пошукі і намаганні Браніслава. Гэты кантакт дае добры плён.

Клуб у Аплісе стаў сапраўдным асяродкам культуры, любімым месцам адпачынку вясковых жыхароў. І амаль кожны з іх можа сказаць: «Клуб — мой дом».

Не, яшчэ далёка не ўсё тут гладка і добра, як хацелася б. Некаторыя тэматычныя вечары праходзяць сумна і нецікава. Яшчэ не ўсе формы і метады культурна-асветніцкай работы выкарыстоўваюцца для прапаганды вялікай ленінскай спадчыны.

Трэба шырэй і актыўней прапагандаваць культуру быта, распаўсюджваць педагагічныя веды, часцей абмяркоўваць цікавыя кнігі і фільмы.

Карацей, работы непачаты край. Але тое, што ўжо зроблена сведчыць аб вялікіх магчымасцях аплісіх энтузіястаў культуры, аб тым, што яны на правільным шляху.

М. ШМАТКОЎ,
намеснік начальніка Упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкома.

БАЛГАРСКІЯ ПЕСНІ НАД ДНЯПРОМ

Гарачымі апладысментамі ўзнагароджвалі магіляўчане ўдзельнікаў першага канцэрта змешанага хору і танцавальнага калектыву з балгарскага горада Габрава, які адбыўся сёння ў летнім тэатры. Гарачае адабрэнне выклікалі балгарскія і савецкія песні. Вялікі поспех выпаў на долю танцавальнага калектыву.

Балгарскія самадзейныя артысты прабудуць на Магілёўшчыне чатыры дні. Яны пакажуць сваё майстэрства рабочым і служачым Магілёўскага завода імя Кірава, саўгаса «Вейна» Магілёўскага раёна, жыхарам Бабруйска.

Гэты прыезд балгарскіх сяброў у Беларусь прысвячаецца 25-годдзю сацыялістычнай рэвалюцыі ў Балгарыі.

Працоўныя Магілёўшчыны і Габраўскай акругі Балгарыі падтрымліваюць пастаянную дружбу. Яны часта абменьваюцца дэлегацыямі рабочых, земляробаў, партыйных, прафсаюзных і камсамольскіх работнікаў, дзеячоў культуры і навукі, вунацца адзін у аднаго.

БЕЛТА.

ТАВАРЫШЫ ПА ЗБРОІ

Многія пісьмы, якія прыходзяць у сталіцу Абхазскай Аўтаномнай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі—Сухумі на імя заслужанага мастака Грузінскай ССР Чола Кукуладзе, памечаны штэмпелямі розных гарадоў і сёл Беларусі. Гэта не дзіўна: Кукуладзе ў гады мінулай вайны быў удзельнікам партызанскага руху на беларускай зямлі, дзе і зараз жывуць яго таварышы па зброі.

Многія патрыёты загінулі смерцю храбрых, але памяць аб іх жыве. Некалькі гадоў назад тры тысячы былых партызан сабраліся на кургане ў раённым цэнтры Расоны. Сярод тых, хто прынёс сюды па жменьцы зямлі, быў і сухумскі мастак Чола Кукуладзе. Былыя байцы партызанскай брыгады вырашылі пабудаваць тут у памяць загінуўшых таварышаў манумент Перамогі — сімвал гераічнай перамогі народа супраць фашысцкіх ордаў. Кукуладзе стаў адным з аўтараў гэтага помніка.

Усе гады Чола Кукуладзе з натхненнем працуе над партызанскай тэмай. Зараз у Музеі славы Расонаў выстаўлена некалькі яго твораў, у тым ліку палатно «Смерць партызана». У гэтыя дні мастак заваршае работу над манументальным палатном «Нарада перад боем».

На беразе возера ў ваколіцах Расонаў па малюнках сухумскага жывапісца ўзноўлены двухпавярховы домік лесніка, дзе знаходзіўся адзін са штабаў партызан. Гэты домік быў спалены фашыстамі. Тут абсталяваны цяпер філіял сельскага Музея славы.

АДН.

АРХІТЭКТУРА

ГОРАД ДЫКТУЕ ДОЙЛІДУ

- НЕПАЎТОРНАСЦЬ—ДЗЕ ЯЕ ШУКАЦЬ!..
- МІКРАРАЁН ПАВІНЕН БЫЦЬ ПРЫГОЖЫМІ..
- КАМУНІКАЦЫІ ПАДЗЕМНЫЯ І НАДЗЕМНЫЯ
- У ЧЫМ САКРЭТ СТЫЛЮ!..

КРАІНА ідзе насустрач слаўнаму юбілею — 100-годдзю з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна. І нам, архітэктарам, вельмі прыемна ведаць, што ў развіцці народнай гаспадаркі, у будаўніцтве роднай дзяржавы — ёсць доля і нашай працы, працы горада-будаўнікоў, стваральнікаў новых сёл, той працы, якой Уладзімір Ільіч з першых жа гадоў Савецкай улады надаваў выключную ўвагу.

Клопаты Камуністычнай партыі аб тым, каб нашы гарады былі зручныя, каб яны былі прыгожыя і мелі сваё непаўторнае аблічча, свой стыль, мы адчуваем на кожным кроку ў сваёй дзейнасці.

Вось сталіца нашай рэспублікі— Мінск. Горад, узняты з руін. Горад, у якім і сёння не спыняецца вялікае будаўніцтва — прамысловых прадпрыемстваў, культурных устаноў, жытла. Развіваецца транспарт. На гарадскіх магістралях курсіруюць камфартабельныя аўтобусы, тралейбусы. Мінчане не без падстаў мараць пра метро.

Растуць і харашэюць усе беларускія гарады. І чым вышэй гэты рост, чым больш яны прыгажэюць — тым большай становіцца і наша адказнасць, адказнасць дойлідаў перад сучаснікамі і перад будучымі пакаленнямі.

Гарады дыктуюць дойлідам напрамкі новых творчых пошукаў. Расце роля тэарэтычнага абагульнення набытага творчага вопыту, роля прагназіравання на навуковай аснове будучыні нашых гарадоў.

За апошнія гады ў Беларусі выйшлі працы па горадабудаўніцтве, такія, як «Новыя гарады Беларусі», «Даведнік па добраўпарадкаванні і азеляненні гарадоў», «Архітэктура і планіроўка малых гарадоў», «Горадабудаўнічая эфектыўнасць і бяспека руху», «Праектаванне жылых і грамадскіх будынкаў» і шэраг іншых. Але скажам шчыра, што ў цэлым наша тэарэтычная думка ўсё яшчэ адстае ад маштабаў будаўніцтва, якое мы вядзем.

Возьмем навукова-даследчы інстытут будаўніцтва і архітэктуры, які ствараўся як установа для даследавання найбольш надзённых праблем архітэктуры, будаўніцтва. У апошнія гады гэты інстытут больш заняты праблемамі тэхналагічнымі, чым горадабудаўнічымі, тымі, якія маглі б даць немалы эфект.

А праблемы горадабудаўніцтва ўзнікаюць і патрабуюць свайго вырашэння.

Вось, напрыклад, шматлікія выказванні ў друку аб падабенстве новых гарадоў і мікраёнаў. У аснове гэтага падабенства, на думку многіх, — тыпавыя праекты.

Але ці так гэта? Пытанне патрабуе ўсебаковага і аператыўнага даследавання. Жыццё падказвае, што тыпавыя праекты сапраўды часткова ўплываюць на падабенства гарадоў, на невыразнасць аблічча вялікіх гарадскіх раёнаў. Але ж прычына не толькі ў гэтым.

Умелае спалучэнне дамоў павышанай колькасці паверхаў, гарызантальных і высотных, з рознымі варыяцыямі іх размяшчэння на ўчастку, актыўнае скарыстанне мясцовага ландшафту, азеляненне — хіба гэта не шляхі пошукаў непаўторнага аблічча нашых гарадоў?

Прыгажосць — спалучэнне заканамернасцей і асобных адступленняў ад іх. Заканамернасць і выпадковасць — процілеглыя з'явы, якія ў спалучэнні ўтвараюць прыгажосць. Але ж мы можам браць у разлік толькі тую выпадковасць, якая выклікаецца неабходнасцю, калі хочаце нават — мэтазгоднасцю.

У Беларусі магчымасцей для фарміравання непаўторных па абліччы гарадоў — колькі хочаце: своеасаблівасць рэльефу, водныя прасторы, маляўнічыя лясныя масівы, рэкі...

Але вось перад намі Мазыр — цэнтр Палесся, маляўнічы горад на Прыпяці. Рэльеф тут перасечаны, шмат зеляніны, на беразе парк — цудоўнае месца адпачынку. Здавалася б, вось дзе разгарнуцца дойліду! Але ж ёсць праекціроўшчыкі, якія мяркуюць, быццам будаўніцтва горада трэба перанесці на новую, гладкую, як стол, пляцоўку за тры кіламетры ад ракі. Абгрунтаванне: стары горад і яго ваколіцы моцна пасечаны ярамі...

А хіба не тая ж праблема паўстае перад дойлідамі Гродна?.. Яны таксама лічаць за лепшае будаваць новыя раёны на роўных пляцоўках, пакідаючы па-за ўвагай багаты ландшафт высокіх берагоў Нёмана. А між тым, якраз тут на высачэзных кручах маглі б стаць будынкі, якія б упрыгожылі горад.

Гэта толькі ад захаплення тэхналагічнымі праблемамі, ад нераспрацаванасці горадабудаўнічых праблем нестае мудрасці скарыстаць тэрыторыю існуючага горада, арганізаваўшы забудову тэрасамі — такім маляўнічым, прыёмам, які дае магчымасць арганічна звязаць натуральнае і штучнае асяроддзе, які здольны ўзбагаціць сілуэт і прасторавае вырашэнне горада. Тэрасы даюць магчымасць аддзяліць пешаходаў ад транспарту, дно яроў скарыстаць для пропуску транспарту, а верхнія ярусы — для забудовы.

Толькі прыгадайце, які прыгожы Мазыр у вячэрні час пры электрычным асвятленні, асабліва, калі пад'язджаеш да яго з боку Калінкавіч. У такіх гарадах, нельга абыходзіць абжытасць, зручнасць узаемасувязей жыхароў, даступнасць аб'ектаў абслугоўвання і г. д.

Многае можа даць для стварэння непаўторнага аблічча нашых малых гарадоў і вопыт мікраёнаў у вялікіх гарадах, як бы гэтая думка ні здалася дзіўнай. Уся справа ў тым, як падыходзіць да мікраёна, да малога горада.

Адзін з першых мікраёнаў Мінска — раён вуліцы Арлоўскай быў задуманы невялікім, з замкнёнымі перспектывамі. Бульвар імя Шаўчэнкі замыкаецца мікраённым садам са стадыёнам, па восі якога размешчаны клуб, а з флангаў — дзве сярэднія школы. Асобны невялікі камунальны квартал выдзелены для размяшчэння буйнай кацельнай, бытавых майстэрань, гаражоў для індывідуальнага карыстання. Я не буду гаварыць пра ўсе зручнасці ў гэтым мікраёне. Аб усім ужо неаднаразова пісалася. Скажу толькі, што даўно ўжо наспела пара завяршыць азеляненне гэтага мікраёна, стварыць стадыён на натуральным схіле, своечасова абнаўляць афарбоўку балконаў і асобных дэталей дамоў. Тады гэты жылы масіў атрымае завершаны выгляд. Тады варта будзе яго ўключыць нават у спіс экскурсій па горадзе, як у адзін з першых мікраёнаў, які, дарэчы, вельмі падабаецца яго жыхарам.

Уплывае на зручнасць горада, на яго прыгажосць — вырашэнне камунікацый, як падземных, так і надземных. Пад зямлю варта хаваць не толькі інжынерныя, але і многія транспартныя камунікацыі. Арганізацыя руху транспарту і пешаходаў паўплывае і на аблічча горада, на яго стыль. У многіх выпадках узнікае неабходнасць не ў лінейна-плоскасных, а ў прасторава-ярусных вырашэннях транспартных вузлоў. Калі ўжо зайшла гаворка пра актыўнае скарыстанне падземнай прасторы гарадоў, дык падкрэслю: ужо сёння трэба клапаціцца аб праектаванні мінскага метрапалітэна, каб пазбегнуць памылак у размяшчэнні пешаходных пераходаў, якія ўзнікнуць раней, чым метро.

Мне здаецца, калі мы навукова падыдзем да праблем арганізацыі малых гарадоў, мікраёнаў у вялікіх гарадах, калі будзем больш актыўна скарыстоўваць ландшафт, усе ўзроўні камунікацый і г. д., — мы наблізімся і да сакрэту непаўторнасці гарадскога аблічча, да сакрэтаў стылю, у якім гаспадарыць будуць мэтазгоднасць і прыгажосць.

Непаўторнасць гарадскога стылю заключаецца ва ўмелым скарыстанні прыродных багаццяў ва ўзаемадзеянні з штучным асяроддзем, у дынамічнай раўнавазе гэтых двух асноўных кампанентаў. Дадайце сюды аб'екты манументальнай прапаганды, якія абавязкова трэба ўключаць у генеральныя планы гарадоў.

Знайсці прыгожыя прапорцыі ў адным будынку — частка задачы. Трэба яшчэ знайсці прыгожыя прапорцыі і ў комплексе будынкаў, і ў комплексе ўсіх ансамбляў, з якіх складаецца горад. Толькі тады мы дасягнем станоўчага выніку, тады створым адмысловы архітэктурны стыль.

Зрабіць нашы гарады прыгожымі, утульнымі, зручнымі — хіба можа быць задача больш высакароднай для дойліда. У нас ёсць усё для таго, каб яе выканаць.

А. КУДРАВІЦКІ,
кандыдат архітэктуры.

ПРА ТЫХ, КАГО НЕ БАЧЫЦЬ ГЛЯДАЧ

ЧАРАДЗЕЙНАЯ РУКА ГРЫМЁРА

У АДНЫМ з апошніх нумароў «Литературной газеты» апублікавана гутарка з Аляксеем Баталавым. У гэтай гутарцы ёсць некалькі радкоў аб грыме: маўляў, у Баталава ён заўсёды надзвычай скупы. Так, Баталаў умее пранікаць у чалавечую псіхалогію, і асаблівай патрэбы ў грыме не адчувае. Аднак... Аднак, нават так званы лёгкі грым — гэта нялёгкі пошук. Бясконцыя гадзіны праводзіць грымёр, каб знайсці адзіны мазок, адну рысачку, якія зробяць твар акцёра яшчэ больш валявым, мужным або наадварот — слабым, бездапаможным. Адзін мазок... А што мы, ведаем пра яго?

У кіно грым прыйшоў з тэатральнай сцэны ўжо ўзбагачаны немалым вопытам і добрымі традыцыямі. Але вельмі хутка грымёрам кіно давялося перагледзець прыёмы, тэхніку грымёравання. Мікалай Канстанцінавіч Чаркасаў, параўноўваючы работу грымёраў кіно і тэатра, гаварыў, што хоць задача ў іх адна, грым акцёраў кіно значна адрозніваецца ад тэатральнага. У тэатры твар акцёра, як правіла, далей дзевятага-дванаццатага раду ўжо кепска відаць, у кіно, зняты буйным планам, павялічаны ў некалькі разоў, ён прадстае перад намі ва ўсіх падрабязнасцях. Таму ў кіно грым павінен быць асабліва тонкі, ювелірны.

Апошнія тыдні вялікая грымёрная на кінастудыі «Беларусфільм» цалкам аддадзена мастаку-грымёру Соф'і Ізраілеўне Міхлінай. У павільёнах і на пляцоўцы за студыяй, дзе ўзведзена грандыёзная дэкарацыя — славуты дворык з фантанам і галерэі Ягелонскага універсітэта ў Кракаве — заканчваюцца здымкі фільма пра Францішка Скарыну.

У адным з крэслаў — Капернік (артыст А. Памазан). Пройдзе крыху часу, і чалавек, вельмі падобны на Каперніка, устане з гэтага крэсла. А пакуль Соф'я Ізраілеўна хутка «прайшлася» тампонам і пэндзлікам па твары, прыладзіла на галаву акцёра доўгі цёмнакаштанавы парык — і з люстэрка глянуў на мяне другі твар. Хто ведае, можа якраз цяпер акцёр і стаў тым Капернікам, якога потым мы ўбачым у кіно, якому паварым.

А вось у крэсле—Мікалай Грыцэнка. І зноў расчоска, брылін, грым, няўлоўны рух рук, і перад намі ўжо не артыст Грыцэнка, а заклапочаны немалады барон.

У перапынку Соф'я Міхліна расказвае:

— Зараз наша задача — захаваць ужо знойдзены і апрабаваны грым. Зразумела, больш складаны пачатак работы — пошук грыму. Нярэдка здараецца так, што акцёр ужо зацверджаны на ролю, а пошукі грыму ідуць яшчэ доўга. Наша канчатковая мэта — дапамагчы акцёру раскрыць вобраз. Вы ведаеце, ёсць такія артысты, для якіх знешні воблік — той адпраўны пункт, з якога пачынаецца вобраз.

Ну, а з чаго пачынаем мы? У нас шмат сакрэтаў, якія даўно перасталі быць сакрэтамі, прыёмы, якія дапамагаюць дасягнуць жаданых вынікаў. Шаблоны ў нашай рабоце недапушчальныя. Здараецца, што даволі аднаго-двух штрыхоў, а іншы раз б'ешся бясконца доўга... Нам, грымёрам, трэба не толькі вывучаць асаблівасці твару, скуры, форму галавы акцёра, а і ведаць яго характар, манеру яго ігры. Толькі тады грым «кладзецца», робіцца германічным, дапамагае раскрыць псіхалогію героя. Акрамя таго, мастак-грымёр заўсёды павінен улічваць асаблівасці плёнкі, на якую здымаецца фільм, добра ведаць мастацкую манеру аператара. Вядома, што плёнка «бачыць» лепш за вочы, і таму нават нязначная неахайнасць «лезе» з экрана буйным прапікам. Глядач не павінен бачыць накладак, мазкоў, парыкоў, трэба, каб ён паверыў у натуральнасць героя.

Творчая біяграфія аднаго з вядучых мастакоў-грымёраў нашай кінастудыі Соф'і Ізраілеўны Міхлінай пачалася ў Адэсе. Пасля заканчэння грымёрнага аддзялення Адэскага тэатральна-мастацкага вучылішча яна ўдзельнічала ў стварэнні кінафільмаў «Аповесць аб першым каханні», «Смага», «Два Фёдары». Потым Міхліну запрашаюць на «Беларусьфільм», дзе яна працуе над фільмамі «Наперадзе круты паварот», «Праз могілкі», «Альпійская балада», «Тысяча вокнаў», «Апошні хлеб», «Дзесятая частка шляху», «Годны да нестраявой». Сотні персанажаў, дзесяткі герояў з грымёрнай Соф'і Міхлінай пачыналі свой шлях на здымачную пляцоўку.

Многія запамяталіся Соф'і Ізраілеўне і сярод іх — Джулія (Л. Румянцава) і Іван (С. Любшын) — героі «Альпійскай балады». Мяняць аблічча акцёраў не было патрэбы: і ўзростам, і знешнасцю яны задавольвалі рэжысёра Барыса Сцяпанава. Аднак, трэба было падкрэсліць, што яны — вязні канцлагера. Доўга шукалі прычоску Джуліі. Хацелася, каб яна была кароткай і ў той жа час надавала жаноцкасць і мілаўзднасць твару.

На дзве тысячы метраў у горы падымалася Соф'я Міхліна са сваёй дзяжурнай грымёрнай скрынкай толькі для таго, каб у стомленай ад доўгага пераходу Джуліі з'явіліся ледзь прыкметныя маршчынкі пад вачыма, каб выступіў пот, каб па шчацэ пракацілася сляза і нерасчэсаныя, зблытаныя валасы ўсё-такі не рабілі яе непрыемнай.

Запомнілася і работа над грымам Сазона Іванавіча (В. Белакураў) у фільме В. Турава «Праз могілкі». Задума рэжысёра — стварыць збіральны вобраз беларускага партызана, пажылога ўжо, які многа перажыў. Давялося папрабаваць мноства варыянтаў пакуль, нарэшце, грым не «знайшоўся», не стаў адпавядаць унутранай, духоўнай сутнасці героя, задуманага аўтарам, акцёрам і рэжысёрам.

Самай складанай работай, а таму захапляючай і цікавай, Соф'я Ізраілеўна лічыць свой удзел у каляровай, шыракаэкраннай кінакарціне Барыса Сцяпанава пра Францішка Скарыну.

Падзеі карціны адбываліся ў канцы XV — пачатку XVI стагоддзя. Узнавіць эпоху, касцюмы, аблічча герояў — агульная задача ўсёй групы. Зыходным матэрыялам сталі карціны, граюры, ілюстрацыі эпохі Скарыны, творы самога Скарыны і яго сучаснікаў.

— Мы не ставілі задачы дабіцца партрэтнага падабенства са Скарыной, — гаворыць Соф'я Ізраілеўна. — Мы рашылі стварыць вобраз чалавека інтэлектуальнага, адукаванага.

Дзеянне фільма развіваецца ў біяграфічнай паслядоўнасці і ахоплівае каля дзесяці гадоў жыцця героя, і знешні вобраз Скарыны павінен змяняцца адпаведна ўзросту, адпаведна ўнутранаму стану. Так што папрацаваць з Алегам Янкоўскім, выканаўцам ролі Скарыны, давялося многа. Па фота можна прасачыць, як змяняўся яго твар. Вось ён яшчэ юнак з адкрытым, светлым позіркам, потым студэнт, далей — малады вучоны, які ўжо многа пабачыў, і, нарэшце, недзе ўжо трыццаціпяцігадовы, з сівізнай, унутрана спакойны і засяроджаны вучоны.

Грыма выкарыстана ледзь-ледзь. Але напэўна высокае майстэрства грыміроўкі ў кіно якраз у тым, каб гэтым «ледзь-ледзь» дапамагчы артысту.

Пасля паездак у Талін і Вільнюс кінагрупа карціны пра Скарыну зноў дома. І зноў акцёры праходзяць праз грымёрную Соф'і Міхлінай, зноў яна са сваёй дзяжурнай скрыначкай на пляцоўцы...

Л. ПРАКОПЧЫК.

Так будзе змяняцца твар Францішка Скарыны на працягу фільма...

ЯК ХЛЕБ НАДЗЁННЫ

Раніца. Да адкрыцця кнігарні яшчэ цалая гадзіна, а ля ўваходу ўжо сабраўся натоўп. Любяць у Паставах сваю кнігарню. У чым жа сакрэт яе папулярнасці?

Як толькі пераступіш парог магазіна, адразу адчуваеш, што тут працуюць сапраўдныя кнігалюбы. У зале чыста, акуратна, на паліцах многа кніг. Можна самому і выбраць, што больш падабаецца. А выбраць ёсць з чаго. Работнікі кнігарні, нібы лоцманы ў моры, заўсёды дапамогуць кожнаму знайсці свой «астравок».

Гадоў дзесяць назад прыйшла сюды працаваць Вольга Міхайлаўна Лосева. Спачатку не клеілася. Паліцы былі забіты кнігамі, пакупнікі часта выходзілі з магазіна з пустымі рукамі. Вольга Міхайлаўна пачала карпатліва вывучаць попыт, часцей заглядваць на базу. Але мець запас ходкіх кніг — гэта далёка не ўсё. Кнігі трэба ўмець прадаваць. А для гэтага трэба добра іх ведаць, шмат чытаць, каб цікава расказаць чалавеку пра той ці іншы твор.

Вольга Міхайлаўна вялікі аматар чытання, а як пачне расказваць, дык заслухаешся. Часцяком выступае яна на канферэнцыях чытачоў, літаратурных вечарах, у раённым Доме культуры. Дзяжуючы старанням Вольгі Міхайлаўны, Пастаўская кнігарня зараз адна з лепшых у вобласці. Толькі пастаянных падпісчыкаў у магазіне каля шасцісот чалавек. Добра ведаюць дарогу ў кнігарню жыхары з блізкіх і далёкіх вёсак Пастаўшчыны і нават з суседняга раёна, суседніх гарадоў.

Асаблівы клопат Вольгі Міхайлаўны, прадаўцоў кнігарні Юзэфы Герасімчук і Лілі Станюш прапаганда твораў У. І. Леніна, кніг пра любімага правадыра і яго паплечнікаў. У кнігарні афармлены вялікі стэнд, на якім багаты выбар твораў Ільіча.

Як толькі прыбывае літаратура, Вольга Міхайлаўна бярэцца за тэлефон, піша пісьмы, паведамляе ўсім бібліятэкам. Кантакт паміж работнікамі кнігарні і бібліятэкамі даволі трывалы. Разам з бібліятэкарамі Дзінай Івановай, Ганнай Стаханоўскай прадаўцы кнігарні правялі ў Курапольскай і Хацілоўскай бібліятэках канферэнцыі чытачоў па раманах І. Шамякіна «Сэрца на далоні», Івана Мележа «Людзі на балоце».

Трэба сказаць, што работнікі кнігарні з асаблівай любоўю прапагандуюць беларускую літаратуру. Аб іх поспехах у гэтым гаворыць адна лічба — сёлета яны прадалі беларускіх кніг больш чым на чатыры тысячы рублёў. Попытам карыстаюцца творы Янкі Брыля, Петруся Броўкі, Аркадзя Куляшова, Максіма Танка і іншых пісьменнікаў. Неяк пабываў у Паставах Сяргей Грахоўскі. Работнікі кнігарні арганізавалі выстаўку-продаж яго твораў.

Работнікі магазіна па-рознаму прапагандуюць кнігі. Добра дапамагае ім савет садзейнічання, які складаецца з актывістаў-камсамольцаў. Члены савета — заўзятыя кнігалюбы, няўрымслівыя распаўсюджвальнікі літаратуры.

Калі ў Паставах праводзіцца сход або канферэнцыя спецыялістаў сельскай гаспадаркі, настаўнікаў, культработнікаў, там заўсёды ўбачыш гаспадыню «перасоўнага прылаўка» Алену Таяновіч. Кнігі яна падбірае з улікам прафесійных інтарэсаў удзельнікаў мерапрыемстваў. І таму гандаль ідзе ў яе бойка.

Ёсць пры кнігарні аўталаўка. Шафёр-прадавец — Павел Каршакоў — жаданы госць на сяле. Яго зялёны аўтафургон добра ведаюць ва ўсім раёне. Ён возіць самы каштоўны тавар — кнігі.

Вось такая крыніца ведаў ёсць на вуліцы Леніна ў Паставах.

М. ПАШКЕВІЧ,
старшы таваразнаўца Віцебскага аблспажыўсаюза.

ПА ВЫСТАВАЧНЫХ ЗАЛАХ

ВОБРАЗЫ УЛАДЗІМІРА РАМАНАВА

У МІНСКІМ Доме архітэктара наладжана выстаўка жывапісу, разьбы па дрэве, графікі Уладзіміра Раманава. Аўтар гэтых твораў працуе кіраўніком групы беларускага філіяла Усесаюзнага навукова-даследчага інстытута тэхнічнай эстэтыкі. Яго асноўная прафесія — распрацоўка інтэр'ераў і абсталявання для прамысловых прадпрыемстваў. А ўсё, што паказана на выстаўцы, — створана ў вольны ад работы час. У асноўным гэта жывапісныя кампазіцыі.

Скажу адразу, пры першым знаёмстве з творамі пазнаеш, у каго вучыцца мастак. Яму па душы Рэрых з яго непаўторным кампазіцыйна-рытмічным ладам — асабліва гэта адчувальна ў кампазіцыях на гістарычныя тэмы. Яму па душы Астраухаў з яго стрымана-пяшчотным, на дзіва тонкім каларытам. Гэтага нельга не адчуць, разглядаючы прадуманы ў дэталях і ў адценнях тонаў пейзаж «Палі» — з такім просценькім краявідам: дрэвы, зямля, а над імі — спаласаванае хмарамі неба. Тоны і паўтоны неба і даюць падставы прыгадаць Астраухава, хаця той трымаўся зусім іншай манеры пісьма. І яшчэ мне здалося, калі я глядзеў маленькія пейзажы Ул. Раманава, што для яго не абыякавы вопыт такога жывапісца, як Рамадзін.

Беручы ў настаўнікі такіх розных па творчай індывідуальнасці папярэднікаў, малады мастак, які мае за плячыма не такі ўжо багаты творчы шлях, здолеў застацца самім сабой. Літаральна ў кожнай рабоце, у больш удалай і менш удалай, адчуваеш трывалы, упэўнай меры самастойны падыход і да тэмы, і да сюжэта, і да сродкаў іх увасаблення: праз моцны ўплыў папярэднікаў прабіваюцца мастакоўскія перакананні. І гэта дае падставы патрабавальна гаварыць пра паказаныя творы і чакаць новых, больш самастойных, больш дасканалых.

Шчыра скажу, што мяне не надта захапілі палотны, прысвечаныя старажытнай Русі, хаця ў гэтых работах нямала станоўчых якасцей. І трыццаць «Нашэсце», «Бітва», «Вызваленне», і палотны «Старажытнасць», «Зямля руская», — хочаш не хочаш, але нагадваюць многія аналагічныя спробы па-мастацку пераасэнсаваць узаемасувязь мінулага і сучаснага. **Так** гаварыць пра Русь пасля Рэрыха спрабавалі многія. І — спрабуюць. Але ўдалося непаўторнае слова сказаць, бадай, толькі Корыну. Але не зразумейце, быццам я суперэчу гэтых работ Ул. Раманава. Зусім не! Я проста ў іх бачу менш самастойнасці. Ды і гэта не дзіўна. Бо ў гэтых творах — **школа** мастака, які яшчэ ў тэме Русі скажа больш упэўненае слова. А спадзявацца на гэта ёсць усе падставы. Прыгадайце, напрыклад, невялікае палатно «Умелец» — з добрым пачуццём любові і гумару вылеплены характар. Або «Набат» — таксама маленькае палатно, у якім, як і ў «Умельцы» — выразнае аўтарскае пачуццё.

Яшчэ павінна больш актыўна раскрыцца самастойнае мастацкае мысленне аўтара, трывалыя парасткі якога мы бачым у такіх, напрыклад, работах, як «Пасёлак», «Рака Ісла», «Аўтапартрэт», «Арабінка», «Ля акна», «Студэнтка». І хаця работы гэтыя — вельмі розныя па почырку, у іх больш уладна гучыць свой голас мастака. Магчыма таму, што крыніцы сённяшняга жыцця даюць больш унутранай свабоды мастаку, чым крыніцы гістарычныя. Гаворачы пра Русь старажытную, мастак вымушаны пераадольваць вопыт папярэднікаў і вопыт сучаснікаў, нярэдка мімаволі паўтараючы ўжо сказанае да яго, а вось роздум аб такіх, здавалася б, немудрагелістых з'явах, як сонечны заход над сціплай беларускай рачулкай, як мімалётны настрой дзяўчыны, як снежны дзянёк у рабочым пасёлку, быццам развязвае мастаку рукі, каб даць яму сказаць пра сваё, перажытае.

Тут я павінен агаварыцца, што ўсе работы — і на тэмы гісторыі, і на тэмы сучаснасці — у адзіным рачышчы: гэта задушэўная размова пра ўнутраны свет нашага сучасніка, пра яго прыхільнасці, пра яго захапленні, пра яго любоў да айчыны.

Цікавыя работы Ул. Раманава ў тэхніцы разьбы. Яны добра дапаўняюць яго жывапіс, прысвечаны тэме старажытнай Русі.

А вось што датычыць графікі, яна мала чаго дадае да экспазіцыі. Тут пераважна эскізы твораў, якія мы бачылі ў раздзеле жывапісу, ды паасобныя малюнкі, якія не могуць уразіць ні матывамі, ні культурай выканання.

Выстаўку пакідаеш з добрым пачуццём. Радуешся, што пазнаёміўся з мастаком, творчая індывідуальнасць якога складваецца паспяхова. Гэта прыемна ўсведамляць тым больш, што ў Ул. Раманава — зайздросная творчая воля. Экспанаваныя на выстаўцы творы задуманы і здзейснены мастаком у той час, як ён прымаў актыўны ўдзел у распрацоўцы шэрагу інтэр'ераў беларускіх прамысловых прадпрыемстваў. Было і такое адказнае заданне, як удзел у стварэнні экспазіцыі выстаўкі «Прамысловасць Беларусі і тэхнічная эстэтыка» (яна экспанавалася ў Мінску ў час святкавання 50-годдзя Савецкай дзяржавы).

Ул. Раманаў — удзельнік шэрагу рэспубліканскіх мастацкіх выставак. Думаецца, што такіх сустрэч з яго творамі неўзабаве будзе значна больш.

Ул. БОЙКА.

ЯНЫ ПРЫНЯТЫ Ў САЮЗ АРХІТЭКТАРАЎ

БУЯЛАВА Майя Трафімаўна. Нарадзілася ў 1939 годзе. Скончыла Беларускі політэхнічны інстытут. Працуе галоўным спецыялістам - архітэктарам у інстытуце «Белпрампраект». Адзін з аўтараў праектаў завода імя Кірава ў Віцебску, Магілёўскага і Смаргонскага камбінатаў сілікатных вырабаў, завода аўтамабільных агрэгатаў у Гродна і некаторых іншых прамысловых аб'ектаў.

ДУДЗІН Валянцін Фёдаравіч. Нарадзіўся ў 1936 годзе. Скончыў Маскоўскі архітэктурны інстытут. Працуе галоўным архітэктарам у інстытуце «Белпрампраект». Адзін з аўтараў праектаў 13-паверхова га корпуса СКБ-12 і інжынернага корпуса гадзіннікавага завода ў Мінску. Шмат займаецца інтэр'ерамі. Ім выкананы, у прыватнасці, інтэр'еры новага будынка «Белпрампраекта» ў Мінску.

МУРАШКЕВІЧ Анатоль Кірылавіч. Нарадзіўся ў 1937 годзе. Скончыў Маскоўскі архітэктурны інстытут. Працуе галоўным архітэктарам праектаў у інстытуце «Белпрампраект». Прымаў удзел у распрацоўцы шэрагу буйных аб'ектаў, у тым ліку Віцебскага тэхналагічнага інстытута лёгкай прамысловасці, грамадскіх цэнтраў некаторых прамысловых вузлоў.

САГАЛАЎ Леанід Якаўлевіч. Нарадзіўся ў 1939 годзе. Скончыў Беларускі політэхнічны інстытут. Працуе галоўным архітэктарам праектаў у інстытуце «Белпрампраект». Л. Сагалаў — адзін з удзельнікаў распрацоўкі праектаў саўгасных пасёлкаў у Мінскай і Гродзенскай абласцях, а таксама праекта рэканструкцыі Беларускага аўтамабільнага завода ў Жодзіна і праекта высотнага корпуса інстытута «Белгіпрасельбуд».

СЕМЯНЮК Трафім Трафімавіч. Нарадзіўся ў 1937 годзе. Скончыў па спецыяльнасці «Планіроўка сельскіх населеных месц» Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Працуе начальнікам архітэктурна - будаўнічага аддзела праектнага інстытута «Саюзгіпраменіявадгас». Многія выкананыя Т. Семенюком работы атрымалі высокія ацэнкі. Схема планіроўкі пасёлка «Гвардыя» Берастовіцкага раёна адзначана дыпломам ВДНГ І ступені.

ТАЛКАЧОЎ Станіслаў Максімавіч. Нарадзіўся ў 1935 годзе. Скончыў Беларускі політэхнічны інстытут. Працуе кіраўніком групы аддзела генеральнага плана ў інстытуце «Белпрампраект». С. Талкачоў адзін з аўтараў генпланаў завода электрахаладзільнікаў у Мінску, завода «Мазыркабель», прамысловага вузла ў Пінску, праектаў некаторых заводскіх будынкаў у Мінску і Брэсце.

ЧЫСТОЎСКАЯ Вілора Леанідаўна. Нарадзілася ў 1940 годзе. Скончыла Беларускі політэхнічны інстытут. Працуе кіраўніком групы ў інстытуце «Белкамунпраект». Удзельнічала ў распрацоўцы праектаў Віцебскага завода заточных станкоў, Брэсцкага завода газавай апаратуры, Брэсцкага рамонтна-механічнага завода, тралейбуснага дэпо ў Мінску, аб'ектаў будаўнічай індустрыі і камунальнай гаспадаркі.

ДЗЯРЖАЎНЫЯ ПРЭМІІ БССР

АБМЯРКОЎВАЕМ ВЫЛУЧАНЫЯ ТВОРЫ

ВЯШЧУН ДАБРА І СПРАВЯДЛІВАСЦІ

ВАСІЛЬ Вітка, вядомы ў нашай літаратуры як паэт сур'ёзнай думкі, даўно ўжо стаў майстрам казкі для дзяцей. У гэтым пераконваешся, чытаючы тыя яго шэсць казак, якія сабраны выдавецтвам «Народная асвета» пад адной вокладкай («Казкі»).

Чым прываблліваюць казкі Васіля Віткі? Перш-наперш глыбокім і тонкім веданнем жыцця, і якраз тых яго сфер, у якіх праходзіць маленства чалавека. І потым яшчэ дэмакратычнасцю формы, якая ўспрынята паэтам з найкаштоўнейшых скарбаў народнай паэзіі. Трывалы рэалістычны грунт, багацце нашай рэчаіснасці, глыбокі маральны змест народных казак, песень, былін, легенд, разнастайнасць іх форм даюць паэту падставы высноўваць казкі, напоўненыя подыхам сённяшняга часу і адпаведнымі яму ідэямі і вобразамі.

У невялікай казцы «Дударык», якой адкрываецца кніжка, здаецца, ўсё традыцыйна-звыклае: і каменьчык у полі, на якім прымасціўся дударык, і дудка на раменьчыку, на якой ён пачынае іграць, і сорак восем карабоў пірагоў, якімі надараюць яго за добрую ігру, і клопат пра тое, як забраць тыя пірагі. Але вось урываецца «пад заслону» само сённяшняе жыццё:

Падагналі грузавік,
Для яго — груз вялік.
Папрасілі самазвала,
Ў самазвала сілы мала.

І ўжо нарадзіўся той нечаканы паварот, які становіцца ў канцы адначасова і кульмінацыяй, і развязкай і бярэ на сябе ўсю ідэйна-мастацкую нагрузку, выяўляючы тым самым найвышэйшую паэтычную дасканаласць:

Залучыў я камара,
Магутнага званара.
Той адразу ўзяў мой воз,
Пірагі мае павёз.

Неспадзяванасць канцоўкі, вырашанай у навелістычнай манеры, якраз і выклікае тую бурную рэакцыю ў маленькага чытача (слухача), якая пакідае яго надоўга неабыякавым. Неспадзяванасць жа забяспечваецца ўвядзеннем не нейкіх там адмысловых метафар ці параўнанняў, а тых бачных, адчувальных вобразаў, якімі жыве сёння кожны малыш.

Паэт умее жыць вобразамі, асвоенымі ўжо чытачом, і прыносіць тую духоўную аддачу, на якую і разлічвае, беручыся за рэалізацыю сваёй задумы. Няўдача ў дударыка («ад дудкі — толькі друз») змяняецца радасцю (новая дудка з пяцерчынага хваста, назбіраныя пірагі), прыходзіць новы клопат («запрагаюць каня — ён і воза не скране»), а за ім неспадзяваны выпадак («залучыў я камара»), які аблягчае клопат, выклікае новую радасць. Дынамічны, увесь у руху, дзеянні сюжэт абумоўлівае і высокую якасць верша — энергічнага, адточанага, звонкага.

Чысціня намеру, яснасць думкі, жывая дзейснасць слова — адметныя якасці паэтычнага майстэрства Васіля Віткі. У найвышэйшай ступені гэтыя якасці выявіліся пры напісанні ім такіх твораў, як «Вавёрчына гора», «Буслінае лета» ды «Казка пра цара зубра».

Здаецца, што можна прыдумаць незвычайнае, каб выказаць у каторы раз такую агульнавядомую ісціну, — трэба дапамагаць адзін аднаму ў бядзе. Васіль Вітка дасягае выключнай маляўнічасці ў выяўленні ідэі, бо звяртаецца да самага звыклага. Хто з дзяцей не захапляецца вавёркай?! Хай дзесяць разоў на дзень убачыць дзіця гэтую лясную прыгажуню, усё роўна будзе бурна радавацца. Паэт гэта не аднойчы назіраў і таму так лёгка пайшоў на тое, каб улюбёнку дзятвы — рыжую пястуху — апанавала гора:

Забалелі ў вавёрачкі зубкі —
Не можа раскусіць арэхавай
шкарлупкі.

З першых радкоў казкі чытач пачынае ўжо хваляваца, бо ведае, як гэта блага, калі баляць зубкі, калі перад табой смачны арэх, а няма як яго раскусіць. І пайшла, закруцілася, завіравала агульная трывога: трэба дастаць малаточак, а каб зрабіць яго, трэба знайсці каваля, а каб знайсці каваля — трэба паслаць тэлеграму... Вавёрчыны дочкі апазніліся на пошту, упрошваюць дзятла-начальніка паслаць тэлеграму з маланкай, але «не працуе без перастанку... на пасылках маланка». Адна надзея на дождж... «І з лістка на лісток пацёк ручаёк». Атрымаў каваль — стары воран — тэлеграму. Ды новая бяда: «як зрабіць малаток — няма жалеза». Усё так натуральна. Сапраўды, як часта бывае ў жыцці!

Не як у казцы, а як у жыцці — такое залатое правіла, якім кіруецца ў сваёй творчасці казачнік Васіль Вітка. Не ўскладняць наўмысна жыццё, але і не рабіць яго лёгкім. Толькі ў смелых сутыкненнях, у вострых канфліктах, у настырнай барацьбе сталее характар, нараджаецца вялікая праўда, святкуе перамогу справядлівасць. Такі ідэал паэта. У імя здзяйснення гэтага ідэалу В. Вітка турбуецца пра тое, каб так імкліва рухаўся сюжэт, каб на яго стройную і дзейсную плынь працавала кожная дэталь, каб яна несла ў сабе пэўны сацыяльны і эстэтычны зарад, каб не голым правілам маралі, не лозунгам, а вобразам разварушыць дзіцячую свядомасць, закрануць яго душу.

Знайсці жалеза для каваля бярэцца бусел і знаходзіць яго ў балотнай канаве, дзе загінуў «тыгр» — нямецкі танк. Так незнарок прывязвае паэт сваю казку да пэўнага часу, уводзячы водгалас нядаўняй вайны — забітага «тыгра», якога «маленькія зайкі развінцілі на гайкі». Здавалася б, можна паставіць і кропку. Але паэт дамагаецца яшчэ большага сацыяльнага гучання і ўдакладняе як «характар» таго «тыгра», так і памеры таго малатка, які спатрэбіўся вавёрцы.

Насюблі яны сяк-так
З паганага «тыгра» шэрсці
шматок.
Вось табе і хвалёны танк —
Ледзь хапіла вавёрцы
На малаток.

Скарыстаная побач літота (прыніжэнне, памяншанне значэння зброі ворага) і гіпербала (перабольшанне мірнай зброі) неўпрыкметку, без голай дыдактыкі, раскрываюць чытачу змест мірнага пасляваеннага часу, у які пісалася казка (1947 г.).

В. Вітку не спатрэбілася спецыяльна спыняць увагу на важных сацыяльных вывадах, яны выніклі самі, непрыкметна, але ўражліва, запамінальна, бо набылі вобразнае ўвасабленне. Гэта і ёсць тая ступень пісьменніцкага майстэрства, якая дазваляе пра самае складанае гаварыць проста, адчувальна.

У казках В. Віткі фантазія і рэчаіснасць заўсёды побач, яны ўзаемаўзгоднены, адно другое дапаўняюць, адно аднаму памагаюць. Пісьменнік любіць жыццё ў самых звычайных для яго праявах — любіць лес і звяроў у ім, захапляецца птушкамі. І гэтая любоў, і гэтае захапленне такія вялікія, што звяры і птушкі раптам пачынаюць гаварыць па-чалавечы, а самыя нерухомыя рэчы ажываюць, становяцца героямі яго казак.

Так у «Казцы пра цара зубра» усё, пра што апавядае паэт, жыве багатым, паўнакроўным жыццём. І прыгоды Васі Вясёлкіна, які адважыўся кінуць выклік цару звяроў — белавежскаму зубру, існуюць не дзеля прыгод, а каб даць магчымасць маленькаму чытачу адчуць гонар за свой край, дзе ствараюцца сапраўдныя асілкі-самазвалы, што падымаюць сорак тон грузу. Апавядаючы пра тое, што ўсім добра вядома, В. Вітка ўмее, аднак, прымусіць гэта вядомае ўбачыць яшчэ раз і ўбачыць больш змястоўным, больш прыгожым, больш прывабным. Ці не ў гэтым асноўная задача мастацтва — задавальняць патрэбу чалавека ў харастве, здабытым актыўнай дзейнасцю.

Вобразы для сваіх казак В. Вітка не шукае дзесьці ў чараўнічым свеце. Яны нараджаюцца там, дзе ён жыве, працуе, бывае сёння — на Случчыне, у Мінску, у пушчы Белавежы... І таму, мабыць, яго казкі дыхаюць такой утульнасцю, поўняцца шчырасцю, цеплынёй і першароднай прастатой, нават наіўнасцю, якая выклікае ў чытача спагадлівую ўсмешку. Гумар В. Віткі тонкі, дасціпны і неабразлівы.

Мы ўжо мелі магчымасць у яго «Дударыку» і на старонках часопіса «Вясёлка», які рэдагуе В. Вітка, адчуць неўтаймоўную вынаходлівасць паэта ў стварэнні дзіцячых прыпевак, лічылак, скарагаворак, загадак, што раскрываюць перад маленькім чытачом сённяшні свет у яго шматгалосі і шматфарбнасці. Вытокі гэтай вынаходлівасці варта шукаць у фальклоры, у народных дзіцячых гульнях, якія В. Вітка ведае і творча скарыстоўвае.

«Ціха так, хоць сей ты мак», — гэтай народнай прыкметай-прыказкай пачынаецца казка «Буслінае лета» і адразу настройвае на мірны, лагодны лад апавядання пра хлопчыка Васіля, які, атрымаўшы ў школе заданне «даць прыроды апісанне», садзіцца ля самага вяза, на якім жыве бусліная сям'я, і бярэцца апісваць «побыт бусла да драбніц».

Але ўрываецца перапёлка са сваім «Спаць пара!», і хлопчыку не застаецца нічога іншага, як адкласці свой занятак на заўтра, схаваўшы сшытак у дупло. Назаўтра Васіль не знаходзіць свайго сшытка. Пачынаюцца пошукі сшытка, а з ім і казкі. Гэты натуральны ход дае магчымасць паэту раскрыць бэгаты птушыны свет нашага краю. Прадстаўляючы адну за адной такіх птушак, як перапёлка, ластаўка, сініца, кнігаўка, сарока, зязюля, салавей, аўтар менш за ўсё займаецца апісаннем таго, што на паверхні, што і без яго добра вядома чытачу, а імкнецца паказаць адметнае ў характары, паводзінах кожнай птушкі.

Адсюль і тая багатая інструментоўка верша, якая памагае з першага ўжо чытання пасяліцца надоўга ў памяці:

На мяне ўсё паглядае
І трашчыць, як заваднай:
— За папер-рку
Дай цукер-рку...

Гэта пра сароку.

І так кожную птушку прадстаўляе паэт. Спачатку песняй, потым вонкавым выглядам, а пасля ўжо і яе звычкамі.

В. Вітка не абмяжоўвае сваю ролю традыцыйным бытапісаннем, а патрапляючы надзённым радасцям і клопатам сваіх маленькіх чытачоў, уводзіць іх у багаты свет сённяшніх ідэй і пачуццяў. Іменна такімі добрымі і разумнымі памочнікамі дашкалят і школьнікаў-пачаткоўцаў з'яўляюцца казкі «ППШ» і «Азбука Васі Вясёлкіна».

«ППШ» — гэта птушыная пачатковая школа, у якой дырэктар слаўны Пеця (г. зн. Певень) навучае курэй, гусей, індыкоў... Навучае па сваёй птушынай методыцы, і вучні пасвойму, па-птушынаму авалодваюць ведамі: «Дзюбаю вадзіла гусь і па карце лазіла. Усё шукала Беларусь ў Афрыцы і Азіі. Так шукала ўпарта — выдзяўбла ўсю карту».

В. Вітка не бурыць старыя формы, не касуе старыя прынцыпы, не адхіляе ўсе каноны казкі, што склаліся праз стагоддзі, а толькі рассоўвае, расшырае межы «старога», каб змясціць у ім новае з яго багатым зместам.

У «Азбуцы Васі Вясёлкіна» пераважае свет птушак і звяроў, але паэт імкнецца і ў строгія рамкі дзіцячага вопыту ўкласці як мага больш новай інфармацыі. Гэта яскрава відаць, напрыклад, на літары «Н», дзе абыгрываецца насарог, які так любіць навуку, што прыехаў у школу ажно з Афрыкі.

Паэтыка Віткавых казак — паэтыка найтанчэйшых зрухаў, якія нараджаюць новае. Не бурачы сістэму старой казкі, В. Вітка толькі пашырае яе магчымасці. І гэта, як мне здаецца, плённы шлях.

Таму так згодна жывуць на гэтым шляху пласты традыцыйнай лексікі з новымі словамі. Уводзячы ва ўжытак чытача новае:

Пад крылом адразу знік
У ласушкі градусник —
Перад тым, як даць мікстуру
Трэба знаць тэмпературу.

паэт не забываецца і на старое, самабытнае:

— Ты чаго такі пануры,
У самотнасці і скрусе,
Як пасля якіх хаўтураў? —
Так пытае ў мяне бусел.

В. Вітка вельмі чулы да слова, ашчадны ў рабоце з ім. Ён увесь час як бы памятае, што казка, апавяданая літаратурнай мовай без заглублення ў яе першародныя пласты, будзе гэткай жа беднай, як бедныя нават цудоўна намаляваныя кветкі побач з жывымі.

Мастацкае ўздзеянне казак В. Віткі моцнае і працяглае, бо ў іх поўна любві пісьменніка да свайго народа, да малалетніх чытачоў, поўна багатай фантазіі, напоўненай сур'ёзнай думкай, чыстых пачуццяў, імкліваго дзеяння, драматычнага напружання, сапраўднага харастава. І ўсё гэта падпарадкавана адной задачы — выхаванню дабра і справядлівасці. Удзячныя чытачы «Казак» спадзяюцца ўбачыць імя свайго вешчуна сярод лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі БССР.

Уладзімір ЮРЭВІЧ.

ШТО ЧЫТАЦЬ ПРА ТВОРЫ, ВЫЛУЧАНЫЯ НА ДЗЯРЖАЎНЫЯ ПРЭМІІ

Апалены лотас. Вершы в'етнамскіх паэтаў. Пераклад Я. Семяжона.

Салавей Л. «Апалены лотас». «Беларусь». 1968, № 6.

Яфімаў Ф. Паэзія змагаецца. «Полымя». 1968. № 6.

Салавей Л. Зямля, апаленая гневам. «Сельская газета», 1968, 31 ліпеня.

Гаўрук Ю. Паэзія В'етнама, які змагаецца. «Неман». 1968. № 8.

Янка СІПАКОЎ. Дзень. Лірыка.

Яфімаў Ф. Пажаданне ў пошуках. «Беларусь», 1969, № 5.

Гніламёдаў У., Шпакоўскі І. Дзень пражыты і перажыты. «Літаратура і мастацтва», 1968, 5 ліпеня.

Лойка А. Памераўшы на крылы акіян. «Полымя», 1968. № 11.

Блатун С. У трывозе дня. «Вячэрні Мінск». 1969, 16 студзеня.

Алесь АСІПЕНКА. Вогненны азімут. Раман.

Мялешка А. Праўда суровая, чэсная. «Заря», 1968. 17 кастрычніка.

Герцовіч Я. Звычайнае і незвычайнае. «Беларусь», 1967, № 3.

Пашкевіч Н. Ішоў сорак першы. «Літаратура і мастацтва», 1965, 13 лістапада.

Герцовіч Я. Так пачыналася. «Літаратура і мастацтва», 1968, 9 жніўня.

Ціханчук М. Азімут барацьбы і перамогі. «Звязда», 1968, 25 жніўня.

Клешчанка В. А чабору цвісці! «Чырвоная змена», 1965, 22 верасня.

Мялешка А. Суровая праўда вайны. «Чырвоная змена», 1968, 12 верасня.

Юрэвіч У. Дыханне ваеннай навальніцы. «Сельская газета», 1968, 17 верасня.

ЯРКАЯ, РЭАЛІСТЫЧНАЯ МУЗЫКА

Дзевятая сімфонія М. Аладава прысвечана юбілею Беларусі. Але гэта не летапіс і не схематычная дэкларацыя. У музыцы гарыць чыстае полымя эмоцый, якое асвятляе і вобразы былога, і абрысы сённяшняга дня.

...Ціха застагналі званы. Паплылі густыя вібрыруючыя гукі, замёрлі ў глухім гудзе басоў. Холадам смерці павеяла ад жалобнага харалу духавых. Заплакаў габой-жалейка. Калышуцца цені смерці. Яшчэ больш пяшчотна, пранізліва галосіць, заклінае скрыпка. А ў блакітнай вышыні заспявала серабрыстая флейта. І зноў гудуць, цяжка ўздыхаючы, званы...

Сумную цішыню раптам рассеклі фанфары. І скрыпкі ўжо вядуць бадзёры танец. Павольна ўліваецца ў стыхію танца затоена страсны напеў віяланчэляў. Лірычная песня — светлая, узнёслая.

Недзе ў нетрах, у басовых глыбінях масы галасоў згушчаецца трывога, растуць пагрозлівыя цені. Але светлыя напевы думкі рассейваюць змрок. Цені знікаюць, бурліць радасць, заліхвацкі скамарошы танец, лірычны напеў і радасны марш зліваюцца ў паліфанічным адзінстве...

За плячыма майстра амаль восемдзесят гадоў. Якая энергія, якое шчаслівае ўменне па-юнацку радавацца жыццю, якая ўпартая, усесакрушальная працавітасць у дзесятках музычных партытур, у штодзённай рабоце з вучнямі — колькі іх, хто злічыць? Не пабаюся з мноства створаных М. Аладавым санат, квартэтаў, уверцюр, квінтэтаў, трыо, сюіт, паэм, сімфоній вылучыць Дзевятую як **лепшую**.

У гэтай сімфоніі атрыманы каштоўны сплаў глыбокай думкі і дасканалай формы. Як у фокусе, сабраліся тут здабытыя працай цэлага жыцця рэдкія ўласцівасці таленту кампазітара.

Музыка Дзевятай сімфоніі рэалістычная і глыбока народная. Кантрастныя карціны народнага побыту, пейзаж, магутныя калектыўныя пачуцці — рэльефныя вобразы-абагульненні, поўныя жыццёвай сілы. Побач з імі цвітуць дзівосныя ў сваім небудзённым харастве кветкі лірызму. Мастак не толькі супастаўляе, але і зліваe абагульненае і індывідуалізаванае. У нашы дні зусім не страціла сваёй актуальнасці тыповая для драматычнага сімфанізму мінулага ідэйна-вобразная канцэпцыя, якая развівае думкі аб асобе і грамадстве, аб чалавецтве ў барацьбе з фатальнымі сіламі. Дзевятая сімфонія М. Аладава ўвасабляе такую канцэпцыю і вырашае яе ў безумоўна аптымістычным плане.

Дзевятая сімфонія вырасла на беларускай нацыянальнай глебе. Яе карэнні — у рускай класічнай спадчыне, яе формы і кампазіцыйныя прыёмы, яе інструментоўка — усё адзначана пячаткай самабытнага, глыбока народнага па сваёй прыродзе дараванне.

Тое ж і ў своеасаблівасці жанру Дзевятай сімфоніі. Цеснае перапляценне бытавога і драматычнага пачаткаў утварыла лірыка-жанравы цыкл, унутрана арганічна развіты і цэльны.

Кампазіцыя сімфоніі стройная, адчаканеная ў малых і буйных сваіх ячэйках, зробленая добра, моцнай рукой майстра. Мелодыі-тэмы, якія прывольна льюцца то говарам, то напевам, то танцавальным найгрышам, натуральна развіваюцца ў варыяцыйна-страфічных і ў плаўна-закругленых класічных канструкцыях з абавязковымі, у найдрабнейшых дэталях выпісанымі застаўкамі, акаймаваннямі, тэматычнымі аркамі. Замкнутыя ўнутры сябе часткі-карціны ўтвараюць цыкл з дапамогай складаных і скрупулёзнай, амаль не бачнай вокам у аўтарскай партытуры работы з самымі рознымі элементамі музычнай тканіны. Бясконцае мноства змястоўных падрабязнасцей тэхналагічнага характару гавораць аб прафесіянальнай культуры рэдкай прыгажосці.

Незмаўкальна зацікаўлена гучыць у Дзевятай сімфоніі голас аўтара. У ім — пачуццё адказнасці мастака за ўсё, што робіцца вакол. У светлай любві да людзей і да цудоўнага ў жыцці, і бескампраміснасці адносін да свайго абавязку мастака і грамадзяніна — сучасны пафас Дзевятай сімфоніі і яе высокае этычнае значэнне.

Т. ШЧАРБАКОВА.

Вялікую цікавасць у жыхароў Наваполацка выклікала абласная выстаўка дакументальнага і мастацкага фота, якая адкрылася ў памяшканні Палаца культуры нафтавікоў.

Фота З. БРУКА.

НАШ НЯКРУГЛЫ СТОЛ

пародыі-эпіграмы-усмешкі

Яэзп ТАЎШЧЭЗНЫ

ПЕРАВЫХАВАЛІ

(Міхась Скрыпка)

Драма ў трох актах для мастацкай самадзейнасці

Дзеючыя асобы:

Халімон — брыгадзір.

Сцёпка Дрын — гультай.

Хадора — кабета.

Антось Смык — стары чалавек.

Акт першы

Ферма ў трэцяй брыгадзе. Халімон піша нарад. Антось Смык сядзіць. Хадора п'е з бітона малако і пяшчотна гладзіць рабую цялушку. Па авансцэне ў гальштуку і бліскучых ботах паволі праходзіць Сцёпка Дрын.

ХАЛІМОН: Вунь і Сцёпка ідзе. А гальштук які — бацюхны! **(Да Хадоры).** Як ён, Сцёпка, памагае табе?

ХАДОРА: Ат, памагае... Такі бязмен! Яму б толькі дзе гладыш са смятанай абярнуць... Трэці тыдзень лынды б'е.

СМЫК: Выхоўваць трэба чалавека.

ХАДОРА: Выхаваеш яго, а як жа!

СМЫК: Гэ, і зайцоў вучаць запалкі паліць, а то ж чалавек... Гэй, Сцёпка!

СЦЁПКА: Ну, чаго табе, стары?

СМЫК: Працаваць трэба. От, Хадоры памагчы.

Сцёпка свішча.

ХАЛІМОН: Сцёпка, ёсць работа. Птушынае малако прывезлі. Смачнае, як мёд. Не каштаваў? А пакаштаваць, пэўна, хочацца? Дык вось, сёння пасля работы па два літры будуць даваць. А каму і болей. Хто пастараецца.

СЦЁПКА: Брэшаш!

ХАЛІМОН **(пакрыўджана)**: Як сабе хочаш... Ага, хочаш? То-та. Птушынае малако, брат, гэта табе не рэдзька з хрэнам...

Акт другі

Хадора са Сцёпкам цягаюць бітоны. Са Сцёпкі ручаём цячэ пот.

СЦЁПКА **(спыняючыся перадыхнуць)**: Уф-ф, запарыўся... Лушчыць семкі лягчэй. І цікавей, хвароба на іх... А есці хочацца — быка б з'еў. Разам з хвастом. Далібог!.. Хадора, ці скора кончым?.. Маўчу, маўчу. Птушынае малако — гэта рэч. **(Зноў цягае бітоны).**

Акт трэці

Ферма. Прыцемкі. Стомлены Сцёпка адпачывае. З'яўляюцца Смык і Халімон.

ХАЛІМОН: Ужо ўсё? Ай, Сцёпка, ай, малайчына! А плявузгалі — працаваць не ўмее... Хадора, налі Сцёпку вунь з таго бітона. Там яно, птушынае. Лі, лі, не шкадуй. Лі, колькі вып'е, заслужыў.

Хадора налівае, падае Сцёпку.

СЦЁПКА **(п'е, аблізваецца)**. Ахо-хо, смаката! Зроду нічога смачнейшага не піў. Дзядзька Халімон, пішы на заўтра нарад.

(Знікае).

СМЫК **(разгублена)**. Во, і гультая перавыхавалі... І дзе ты толькі таго птушынага малака прыдбаў, Халімоне?

ХАЛІМОН **(рагоча)**: Птушынага малака? То ж учарашняя сыроватка такой смачнай падалася. Агаладаў гультай, от і здалося яму... Гы-гы-гы, го-го-го, га-га-га...

Смык і Хадора танцуюць. Гледачы паміраюць са смеху. Сцёпка Дрын сніць птушынае малако.

Заслона.

НЕ ПРЫЕДОМ

(Анатоль Кудравец)

Яшчэ а пятай гадзіне раніцы трасцу ведаў стары Сымон Біклага, што з нядыходам шостай наважыць прадаваць сваю хату. Нешта такое, прыгадаў ён, надарылася на пазалеташнія каляды: Антанава Гэлька, што тры гады хадзіла з Домніным Васілём, раптам за якія паўгадзіны акруцілася, з цыбатым Ганніным Лёшкам і на вяселлі ўсё клікала яго Пецем.

Старшы сын даўно запрашаў да сябе ў Клічаў. Пераехаць у горад было спакусліва. Адно трымала—ліфт. Біклага ведаў, што ў гарадах ёсць этажы, і каб хутчэй трапіць на патрэбны этаж, да іх прымайстраваны ліфты. Гэта палохала, а яшчэ больш засмучала. Ліфт... Ліха яго ведае! Дома лепш—ідзі сабе пехатой, няхай сабе і праз Кулінін гарод...

Засяроджана чухаючы сябе за пазухай, Сымон тужліва думаў аб тым, што не паспее руды певень на яго двары сем разоў праспяваць сваю хрыпатую песню, як за адказам прыйдзе адстаўны ляснік Пархвен Жменька, які даўно ўжо прыглядаўся да Сымонавай хаты.

І сапраўды, прыступкі пад Пархвенам зарыпелі ўсяго на пятым «Куна-рэ...». Жменька зайшоў у хату, павітаўся з Сымонавай Матрунай, радасна пацісну Біклагаву пецярню:

— Бачу, удумаў, нарэшце! Даўно пара! Сын цябе зачакаўся, горад вялікі, гэ!

Ад гэтых слоў у Сымона раптам засмактала пад лыжачкай. Ён выразна ўявіў сабе, як павісну ў ліфце на шостым паверсе самай маленькай лічаўскай камяніцы. У хлеўчуку дурным голасам візгацеў галодны парсюк. І Біклагу з таго да слёз стала шкада свайго кута. Растрывожаны, ён ледзьве разумеў, аб чым гаварыў Жменька.

— Колькі, кажу, за свой буданчык з маёй кішэні вымагаеш?

Пры гэтых словах Біклага ўсхамянуўся:

— Колькі? Адно глупства—кладзі мільён. Новымі. А што? Хіба я, а не ты быў лесніком на Голай выспе?

— Міль-ён?—Пархвен пахіснуўся, бы яму ладна пацэлілі чапялой у сківаіцу.

— А то ж, —спакойна пацвердзіў Сымон.—Жытло—яму цаны няма.

Колькі часу Жменька хапаў ротам паветра, нібыта шчупак, выкінуты на Зераг. Пакрысе супакоіўшыся, ён раптам махнуў рукой:

— Ну то... няхай мільён. І пяць тышчаў на магарыч. Бярог дачцы на пасаг, але ж... бяры, ліха з імі! Дзе яшчэ такую хату знойдзеш!..

— Слухай, Пархвене,—узміліўся раптам збялелы Сымон, які не чакаў такога павароту справы.—Ну яго да д'ябла, той мільён, раздумаў я хату прадаваць. Вось табе тры пляшні адступнога, вып'ем! Чуеш, Матрына? Адпішы Сашку з Настай: не прыедом мы! Хай яны самі ў тым Клічаве на ліфтах гойсаюць. Так і адпішы, чуеш? Не прыедом.

Георгій ЮРЧАНКА

ДУЛІ

(Мікола Хведаровіч)

Быў я дбалы, быў увішны,
Усё ішло ў мяне на лад.
. . . . . .
Дзе садзіў я сапяжанкі —
Дулі, дулі спеюць там.

Там, дзе толькі рос любістак
Год і многія гады,
Пасадзіў я ўрачыста
Сапяжанак тры рады.

І цяпер, як толькі ўранку
Кіне сон мяне марыць,
Я па дулі-сапяжанкі
Ўніз бягу з гары, з гары.

Ганаруся перад светам
Пышным садам за вярбой.
Ў Каралішчавічы еду —
Кошык дуль вязу з сабой.

ПА-ЦАРСКУ

(Казімір Камейша)

Я цяжка ступаў, нібы Пётр
Першы,
. . . . . .
Душа уся навострана, як рогі.

Калі на спатканні
Ласіныя рогі
З усмешкай каханая мне паднясе,
Я рухам ніводкым не выдам
трывогі,
Хоць лютасць пачне забіраць
пакрысе.

Душу завастрыўшы і шэпчучы
вершы
Пра жорсткасць, пра здраду,
жаночы падман,
Пайду я, ступаючы, нібы Пётр
Першы,
І хмурачы бровы, як цар Іван.

БУДУ ПРАЦАВАЦЬ

(Кастусь Цвірка)

Я абганяю бульбу.
. . . . . .
У кішэнь дай мне туфлі.

Днямі я ў вёску падскочу,
Работы
Мігам наваліцца з розных бакоў.
Першае дзела —
папраўлю вароты,
Каб не сарвала іх бурай з крукоў.
Потым — сняданак.
З касой накляпанай
Выйду на поплаў, дзе краскі
звіняць.
Побач з пракосамі дзеда Сцяпана
Ляжа маіх сотак семдзесят пяць.
У поўдзень акучнік схаплю
у Аўласа.
— Тпру, Чалы!—пугі ўражу каню.
Маці паводзіць, а я гэтым часам
Роўненька бульбу як след
абганю.

Дровы ж не коланы!
Пнёўо, курчыжка,
Сук на суку,—
а бадай іх пярун!
Плечы распраўлю, ды так, што
засвішча
Над галавою сякера-калун.
Вось-такі вечар.
Стамлюся страшэнна.
Бруд крыху змыю, —
са студні вада.
Туфлі — навошта пыліць! —
у кішэню
І ў Падарэссе да дзевак гайда!..

ДЗВЕ ЗНАХОДКІ

ПЕСНЯ ПАУСТАНЦАЎ 1794 ГОДА

...У верасні 1935 года, у сувязі з VI з'ездам польскіх гісторыкаў, бібліятэка Віленскага універсітэта арганізавала цікавую выстаўку, прысвечаную мінуламу літоўска-беларускіх зямель. Адзін з арганізатараў выстаўкі, вядомы калекцыянер Міхаіл Брашцтэйн, падрабязна апісаў экспанаты выстаўкі ў II томе «Дзённіка VI агульнага з'езду польскіх гісторыкаў у Вільні». У якасці аднаго з найбольш рэдкіх экспанатаў ён назваў рукапіс невядомай «Песні беларускіх жаўнераў» з 1794 года. Аднак сам тэкст твора ні тады, ні пазней апублікаваны не быў, а сляды яго згубіліся.

І вось нядаўна, не без дапамогі знаўцы вільнюскіх архіваў Генадзя Кісялёва, мне ўдалося напасці на гэты след. Беларуская песня касцюшкаўскіх паўстанцаў адшукалася ў 21 фондзе аддзела рукапісаў Цэнтральнай бібліятэкі АН Літоўскай ССР. Гэта — чатыры старонкі рукапіснага тэксту з яўнымі арфаграфічнымі прыметамі XVIII стагоддзя. Усяго ў «Песні» — 60 вершаваных радноў.

«Песня беларускіх жаўнераў» мае патрыятычны характар. Яна заклікае беларусаў даць «сабе рукі ўзаем», каб «адзыскаць» бацькаўшчыну. Многія радкі накіраваны супраць царскага самаўладства і прускіх заваёўнікаў. У «Песні» гаворыцца аб здзеках царскага чыноўніцтва і арміі:

Помнім добра, што рабілі,
Як нас дзёрлі, як нас білі.
Дакуль будзем так маўчаці?
Годзе нам сядзець у хаці.
Нашто зямлю нам забралі?
Пашто ў путы акавалі?
Дачкі, жонкі нам гвалцілі?
Трэ, каб мы ім заплацілі.

У заключэнні песні гучыць заклік узяць зброю ў рукі і далучыцца да касцюшкаўскіх паўстанцаў, выступіць супраць магнатаў-здраднікаў, якім абыякавы лёс радзімы:

Здрада ёсць ужо ў сенаце.
А мы будзем гніць у хаце?
Возьмем косы ды янчаркі.
Пачнем гордыя гнуць каркі!

Зразумела, невядомы аўтар (мяркуючы па мове, ён паходзіў са Слонімшчыны) быў сынам свайго супярэчлівага веку. Ён яшчэ ўскладае вялікія спадзяванні на боскую дапамогу, на тое, што «вольнасць» беларусам дадуць самі паны. Ён яшчэ не зусім разумее розніцу паміж рускім народам і царызмам. У «Песні» адчуваецца шляхецкая абмежанасць. І тым не менш, гэта — вельмі цікавы помнік беларускай літаратуры XVIII стагоддзя, звязаны з імем Касцюшкі і паўстаннем, якое ён узначальваў на тэрыторыі Польшчы, Беларусі і Літвы.

Карыстаючыся выпадкам, хачу адзначыць, што нашаму земляку Т. Касцюшку прысвечаны тансама дзве беларускія народныя песні. Адна з іх пачынаецца са слоў «Слаўна Вільна, слаўна Гродна» і апублікавана ў 1882 годзе нейкім Пламеньчыкам на старонках газеты «Дзённік Познаньскі» (№ 68). Другая песня («Наш Касцюшка слаўны быў») прыведзена ў той жа газеце толькі ва ўрыўках.

НАПІСАНА Ў ЧАСЫ БАГУШЭВІЧА

Даследчыкам гісторыі беларускай літаратуры добра вядома імя Рамуальда Зямкевіча, які збіраў і публікаваў беларускія рукапісы, выступаў з цікавымі артыкуламі. Куды менш вядома асоба яго жонкі Ляоніі Зямкевіч, якая нарадзілася ў 1882 годзе ў Клевіцы Ашмянскага павета і памерла ў 1919 годзе ў Вільні. У свой час яна рэдагавала польскі сацыял-дэмакратычны часопіс «Святло», за што ёй пагражала ссылка ў Сібір.

Як і яе муж, Л. Зямкевіч была страснай збіральніцай рукапісаў і захоўвала не адну памятку, звязаную з беларускай гісторыяй і літаратурай. У прыватнасці, у яе паперах быў верш Л. Вітэна-Дубяйкоўскага «Бура», датаваны 1893 г.:

Стогне віхар, гудзе ў полі,
Гне сталетнія дубы,
Плачуць людзі з горкай долі—
Недзе дзецца ад журбы.

Вые віхар безупынна,
Дрэвы верне з каранём.
А дзе ж гэтаму прычына?
І навошта мы жывём?

Калі ж хмары перастануць
Зацямняці нашы дні?
Калі ж праўда зноў паўстане
І прамень святла бліснe?

Калі ж мы у думцы згоднай
Ўстанем край свой баранціць,
Ў Беларусі — Маці роднай,
Як браты, пачнем жыць?

Ой, не плач, гаротны людзе,
Бо шкада ж нашых вачэй!
Пасля буры ясна будзе,
Заіграе дзень ярчэй.

Калі б хмары не шумелі
Навакол нашых сяліб,
Калі б гора мы не мелі —
Без свабоды памярлі б.

Скора прыйдзе да нас воля!
Ў родным краю—паміж нас—
Заяснее шчасце, доля,
Будзе свята—вялік час.

Як бачым, верш «Бура» вызначаецца даволі высокім ідэйна-мастацкім узроўнем і ў многім сугучны дэмакратычнай паэзіі Ф. Багушэвіча. Аўтарам верша, хутчэй за ўсё, з'яўляецца вядомы архітэктар Лявон Дубяйкоўскі, які пачнеі. у пачатку XX стагоддзя, жыў у Варшаве і быў там адным з кіраўнікоў Польска-беларускага таварыства. «Бура» пашырае нашы ўяўленні аб беларускай літаратуры канца XIX стагоддзя і яшчэ раз сведчыць, што яна не была такой ужо беднай на імёны.

А. МАЛЬДЗІС.

ЗДЫМАЮЦЬ ФОТААМАТАРЫ

Студэнт 5-га курса філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна Уладзімір Філатаў займаецца фотааматарствам яшчэ са школы. Цяпер у яго фотатэцы шмат кадраў аб роднай прыродзе, нашым маладым сучаснику. Ён—аўтар фотавыставак аб інтэрнацыянальных сувязях факультэта, вучобе і адпачынку студэнтаў.

Ніжэй змяшчаем некалькі яго здымкаў.

Акрыленасць.



Поўны штыль.

Геолаг.

Лістапад.



Сярэбраны пояс.

Раніца.

На той бок

ПАЛІТРА ГНЕВУ І СМУТКУ

Асвальда Гуаясамін не ведаў, што такое дзяцінства і школа. Затое ён рана зведаў голад і галечу. Аднак нішто не падарвала ў хлопчыку любві да мастацтва. Суседзі Хасэ Мігеля Гуаясаміна, рамесніка, які перамяніў за сваё жыццё каля дзесятка прафесій, не маглі зразумець, адкуль у яго сына талент мастака. Першае прызнанне свайго даравання хлопчык атрымаў у 10 гадоў, калі здолеў прадаць першы ў жыцці малюнак і прынесці ў сям'ю некалькі манет.

Прайшлі гады, перш чым Асвальда стаў адным з самых славутых мастакоў не толькі сваёй радзімы, Эквадора, але і ўсёй Лацінскай Амерыкі. За гэты час ён перанёс шмат нягод, пакут, цяжкасцей. Вось чаму Гуаясамін, лепш, чым хто-небудзь з яго калег, ведае жыццё народа і тэма народа, тэма абяздоленых, прыніжаных і зняважаных назаўсёды ўвайшла ў яго творчасць.

У гутарцы з праслаўленым эквадорскім мастаком, я запытаўся, чаму яго карціны такія сумныя. Асвальда Гуаясамін адказаў: «Я б ахвотна пісаў пра шчасце і радасць, весялосць і проста ўсмешку. Але, на жаль, не магу. У свеце яшчэ так многа смутку. У свеце, дзе мы жывём, да гэтага часу грымяць стрэлы, паміраюць невінаватыя людзі, ёсць канцлагеры, галеча, голад. Мастак не мае права не гаварыць аб гэтым».

І Гуаясамін кожнай сваёй карцінай пратэстуе супраць сацыяльнай несправядлівасці. На выстаўцы яго твораў, якая праходзіла з вялікім поспехам у Музеі прыгожых мастацтваў чылійскай сталіцы Санцьяга, наведвальнікі маглі бачыць гэты гнеўны пратэст у кожным са 150 палотнаў. Аб гэтым гавораць нават самі іх назвы: «Гнеў», «Боль», «Адзінота», «Стома».

Серыя карцін «Страцілі надзею». Гэта пяць палотнаў. Вы бачыце толькі рукі, напісаныя ў чорна-белых тонах: рукі людзей, якія просяць, умольваюць, абураюцца, страцілі надзею. Але тут жа ёсць і рукі чалавека, які зразумеў, што бескарысна прасіць, трэба патрабаваць, трэба змагацца.

У бліскучым псіхалагічным эцюдзе «Амок» Стэфан Цвейг пісаў, што рукі цудоўна могуць выказаць характар чалавека. Гэтыя словы міжволі ўспамінаюцца, калі знаёмішся з другім вялікім цыклам мастака. Ён не толькі раскрыў характар намаляваных герояў, але праз такую дэталь, як рукі, расказаў пра лёс кожнага з тых, хто пражыў цяжкае і складанае жыццё, прайшоў праз галечу і страх за заўтрашні дзень. Перад намі адчаяныя і абураныя. Але як і ў першым цыкле, галерэю вобразаў заключае палатно, якое заклікае да пратэсту, да барацьбы. Тут ужо няма ні адчаю, ні малення, ні шкадавання. Тут толькі пратэст, прага дзейнасці, прага змагацца за свае правы.

Выдатны майстар паказвае і вінаватых у сацыяльнай несправядлівасці. Гэта серыя так і называецца «Вінаватыя». Вось яны, хто ўвасабляе зло. Гэта перш за ўсё каварная ў сваёй ялейнасці і пакорны каталіцкая царква, рэакцыйная ваеншчына, жорсткія дыктатары, беспрынцыпныя дзялкі. У паказ ненавісных яму персанажаў мастак укладвае ўсю лютасць, увесь свой гнеў, бязлітасна выкрываючы іх паразытычную сутнасць.

Побач карціны, у якіх выказваецца пратэст супраць вайны. Першы твор на антываенную тэму Асвальда Гуаясамін напісаў яшчэ ў 1939 годзе. Апошні — у 1964 годзе. Зараз славуты жывапісец працуе над цыклам твораў, якія выкрываюць брудную вайну, развязаную амерыканцамі ў В'етнаме.

Цікава адзначыць адну дэталь. Як сказаў сам Асвальда Гуаясамін, перш чым напісаць палатно на тую ці іншую тэму, ён павінен абавязкова пабываць на месцы, аб якім будзе пісаць. Доўгі час мастак правёў у Іспаніі, сустракаўся з героямі-рэспубліканцамі. Наведаў памятныя мясціны ў Гвадалахары, бачыў разбураную Герніку. І на свет з'явілася выкрывальная серыя «Іспанія змагаецца». Да таго, як было напісана палатно, што ўслаўляе мужнасць абаронцаў горада на Волзе, эквадорскі майстар некалькі разоў наведаў горад-герой.

Жывапіс мастака пазбаўлены яркіх эфектаў. Яго строгая палітра змяшчае ў асноўным два колеры — чорны і белы. Але якраз гэта строгасць і лаканічнасць яшчэ больш падкрэслівае драматызм яго твораў. Асвальда Гуаясамін усёй сваёй творчасцю, усімі сваімі творамі выкрывае ненавісное буржуазнае грамадства і выносіць яму бязлітасны прыгавор.

А. МЕДЗВЯДЗЕНКА,
карэспандэнт ТАСС.

Сант'яга.

ФЯДОСКІНСКІЯ МІНІЯЦЮРЫСТЫ—ЮБІЛЕЮ ЛЕНІНА

Двухпавярховы будынак Фядоскінскай фабрыкі лакавай мініяцюры, што размешчана за 35 кіламетраў ад Масквы, стаіць на высокім узгорку сярод лясоў. Тут працуюць мастакі, якія простыя чорныя карабочкі і пласцінкі ператвараюць у зззючыя багатым роспісам ларцы, ларчыкі, шкатулкі і сувенірныя экраны.

Гэты цікавы рускі промысел — лакавая мініяцюра на пап'е-машэ — узнік у канцы XVIII стагоддзя. У гады Савецкай улады, дзякуючы арганізацыі ў 1931 годзе Фядоскінскай школы прафесіянальнага навучання, промысел атрымаў высококваліфікаваных майстроў, здольных не толькі да віртуознага капіравання, але і да самастойнай творчасці. Вось тады ў фядоскінскай мініяцюры ўпершыню загучала тэма сучаснасці. У самабытнай творчасці мастакоў-мініяцюрыстаў знайшла сваё ўвасабленне ўся савецкая рэчаіснасць.

Яшчэ ў 30-х гадах малады мастак Віктар Ліпіцкі даў пачатак фядоскінскай Ленініяне. З тых часоў Ленін, яго жыццё і барацьба сталі лейтматывам усёй творчасці Ліпіцкага. За трыццаць гадоў Віктар Ліпіцкі стаў буйным майстрам, вядучым мастаком промыслу. На стэндах фядоскінскага музея яго творам адведзена значнае месца. А побач, у гэтай жа вітрыне, работы малодшага пакалення мініяцюрыстаў.

— Зараз можна назваць больш дваццаці майстроў, захопленых ленінскай тэмай, — гаворыць галоўны мастак фабрыкі Пётр Мачэеў, — сярод іх большасць складае моладзь.

Адзін з іх — Мікалай Саланікін. Яго мініяцюра «Ленін на Пуцілаўскім заводзе» прыцягвае лаканізмам пластычнай мовы, арыгінальнасцю задумы. На спецыяльным конкурсе 1967 года яна была адзначана першай прэміяй.

Настольная пласціна (або экран) — новы для фабрыкі від прадукцыі, які выпускаецца з 1966 года па прапанове Сяргея Рагатава — аднаго з тых, хто праклаў дарогу самастойнай фядоскінскай творчасці.

У другой манеры працуюць мастакі Міхаіл Чыжоў і Іван Страхаў. Для іх Ленініяна — гэта і месцы, дзе жыў і працаваў Ільіч, і справы, здзейсненыя па яго задумах.

Чыжоў — энтузіяст промыслу, аўтар многіх жанравых работ, захаваў старадаўнюю манеру і стыль пісьма. Яго мініяцюры, блізкія да народнага лубка, поўныя наіўнага хараства. Асабліва прыгожы роспіс шкатулачкі «Лямпачка Ільіча». Выдатна валодаючы тэхнікай «скразнога» жывапісу (па сусальным золаце), Чыжоў з поспехам ужыў яе ў гэтай рабоце. Намаляваўшы карціну заснежанай вясковай вуліцы з натоўпам радасных сялян, ён пабудаваў кампазіцыю на эфекце светлавой плямы і тым самым завастрыў увагу гледача на падзеі — з'яўленні ў сяле першай электрычнай лямпачкі.

Пабываўшы ў месцы сібірскай ссылкі Леніна, Іван Страхаў, прызнаны лірык, пясняр роднай прыроды, стварыў пейзажы «Раніца ў Шушанскім», «Будан на возеры Пярова», «Зіма ў Шушанскім».

І зноў імёны маладых: Віктар Борбышаў, Юрый Карапаеў, Лідзія Строганава, Аляксандр Грачоў. Тут і шматлікія ленінскія партрэты яго гімназічных, студэнцкіх і сталых гадоў; Ленін у дні паўстання сярод рэвалюцыйных салдат і Ленін у Крамлі за рабочым сталом або ля карты Расіі. Тэма вырашаецца шырока, разнастайна.

«За ўладу Саветаў» — так назваў сваю работу Генадзь Ларышаў.

— Я ведаю аб грамадзянскай вайне толькі па кнігах і кінафільмах, — расказвае Генадзь, — але ў 1943-м, зусім хлапчуком, я стаяў за такарным станком па 10—12 гадзін у суткі, у той час, як мой бацька біўся з фашыстамі на фронце. І гэта таксама была барацьба за ўладу Саветаў, тых Саветаў, што былі арганізаваны па ініцыятыве Леніна.

Таму, напэўна, столькі экспрэсіі, столькі рашучасці у жэстах чырвонаармейцаў, якія нясуцца на легендарнай тачанцы. Як язычкі чырвонага полымя, падхопленыя парывам ветру, ляцяць коні, захлёстнутыя імклівым віхрам бою: за ўладу Саветаў! Гэта выклік ворагу. Гэта заклік да атакі і кліч перамогі.

Работа гэтая здзіўляе багаццем каляровых адценняў чырвонай гамы, велізарным эмацыянальным запалам, вялікай уражаючай сілай.

Немагчыма расказаць пра ўсе работы. Бо іх больш як дзвесце. З 1966 года было праведзена каля 10 конкурсаў, абласных і саюзных, якія выявілі найбольш уладныя, сталыя работы, што найбольш цікава і арыгінальна трактуюць ленінскую тэму. Некаторыя з іх можна ўбачыць у невялікім пакоі ўзораў на Фядоскінскай фабрыцы лакавай мініяцюры.

У будучым юбілейным годзе фядоскінская Ленініяна папоўніцца новымі работамі лепшых мастакоў промыслу, і няма сумнення, што самыя вартыя з іх будуць экспанавацца на Усесаюзнай юбілейнай выстаўцы 1970 года ў Маскве.

Іта РУМІНА.
(АДН).

МУЗЕЙ ПАД АДКРЫТЫМ НЕБАМ

Надзвычай маляўнічы і прыгожы Танаіс. У перакладзе з грэчаскай мовы гэта азначае «Восьмая рака». Так назвалі Дон у старажытныя часы грэкі, якія прыйшлі на гэтыя землі, багатыя зернем і жывёлай. Тут узнік горад Танаіс, акружаны непрыступнымі сценамі, глыбокімі равамі, грознымі вежамі. Падані і легенды расказваюць аб яго былой магутнасці.

Ішлі вякі. Час захаваў да нашай эпохі толькі рэшткі сцен, абарончых вежаў, жылых пабудоў. Стагоддзе за стагоддзем іх заносіла пылам, зямлёй, яны зарасталі травой, хмызняком. Рэшткі горада былі пад салідным пластом зямлі.

Савецкія вучоныя нанава адкрылі гэты старажытны горад. З кожным годам ён пераўвасабляецца. Вызваляецца ад спрадвечных напластаванняў тое, што здолела захаваць зямля. Археолагі і музейныя работнікі аднаўляюць карціну жыцця тых далёкіх гадоў.

У 1961 годзе тут створаны Гісторыка-археалагічны музей-запаведнік пад адкрытым небам. Цяпер наведвальнікі могуць узняцца на абарончыя сцены, прайсці па вузкай, звілістай вулачцы Танаіса, убачыць яго дамы, пазнаёміцца з гісторыяй, справамі і жыццём людзей далёкага мінулага. Гэта вельмі цікавы помнік старажытнасці. Але нямала трэба зрабіць вучоным, каб раскрыць яшчэ неразгаданыя старонкі гісторыі горада.

На руінах старажытнага Херсанеса таксама заснаваны гісторыка-археалагічны музей. Нягледзячы на неаднаразовыя разбурэнні горада, закладзенага ў 422—421 гадах да нашай эры, многія старажытныя пабудовы добра захаваліся.

Наведвальнікі могуць падарожнічаць па раскопках спецыяльна распрацаванымі маршрутамі. Паміж Антычным і Сярэдневяковым аддзеламі музея створана экспазіцыя з калон сярэдневяковых храмаў, раскапаных у розны час на тэрыторыі Херсанеса. Захаваліся руіны антычнага тэатра, які існаваў на працягу амаль 700 гадоў. Гэта першы антычны тэатр, выяўлены на тэрыторыі Савецкага Саюза.

За апошнія гады створаны новы тып музеяў пад адкрытым небам. Нядаўна іх было ўсяго два. Цяпер колькасць іх павялічылася. Адкрыты музеі не толькі гісторыка-археалагічныя, але і этнаграфічныя, народнага дойлідства і побыту.

Яны ёсць у Эстоніі, Карэліі, Грузіі, Арменіі, Малдавіі, на Украіне. Пашыраецца музей у Кастраме, адкрываецца ў Горкім, Ноўгарадзе, Архангельску, у Валагодскай і Уладзімірскай абласцях, пад Ленінградам і Новасібірскам.

Сярод рускіх музеяў народнага дойлідства асабліва цікавы Кастрамскі. Размешчаны ён недалёка ад цэнтра горада, у месцы ўпадзення ракі Кастрамы ў Волгу, побач з Іпацьеўскім манастыром — ансамбль рускага каменнага дойлідства XVI—XVII стагоддзяў.

Пойма ракі Кастрамы вясной часта заліваецца павадкам, таму ў народным дойлідстве склаліся асобыя векавыя традыцыі. Многія пабудовы ўзводзіліся на высокіх слупах-палях. Яны нібы вісеці ў паветры. Наведвальнік можа ўбачыць цэлыя «вісячыя» вёскі.

На зарослых густым сасновым лесам пясчаных дзюнах, ля берагу возера Югла непадалёк ад Рыгі створаны этнаграфічны Брыдавас-музей, які паказвае экспанаты чатырох правінцый старой Латвіі. Сюды перавезены дзесяткі старажытных драўляных жылых, гаспадарчых і прамысловых пабудоў. Экспануюцца таксама пэрквы, пабудаваныя ў 1704 і 1537 гадах, карчма XVIII стагоддзя.

Ірэн ГРАНДОЎСКАЯ.
(АДН).

ВЫСТАЎКА РАБОТ РОКУЭЛА КЕНТА

Блакітнавата-зялёныя пейзажы Грэнландыі нібы перанесліся на час у невялікі амерыканскі гарадок Брансуік (штат Мэн), дзе адкрылася днямі новая выстаўка работ выдатнага мастака і вядомага грамадскага дзеяча ЗША Рокуэла Кента. Тут, у памяшканні невялікага музея пры мясцовым коледжы выстаўлена каля шасцідзесяці палотнаў і твораў графікі, навеяных у асноўным паездкамі Кента па Грэнландыі.

Ярка-сіняе неба, асляпляльна белыя снягі і айсбергі, грамады чорных прыбярэжных скал — усё гэта таленавіты мастак перанёс на свае карціны, якія пры ўсёй іх своеасаблівасці заўсёды вызначаюцца глыбокім рэалізмам.

«З дапамогай мастацтва мне хоцелася б навучыць усіх людзей любіць прыроду», — падкрэсліў сам Кент на невялікай прэс-канферэнцыі, арганізаванай яго сябрамі з выпадку адкрыцця выстаўкі.

Прыхільнасць Рокуэла Кента да прынцыпаў рэалізму ў мастацтве, а таксама яго актыўныя выступленні супраць вайны і рэакцыі здабылі яму заслужаную павагу прагрэсіўнай грамадскасці ЗША і ўсяго свету. У 1966 годзе яму была прысуджана міжнародная Ленінская прэмія міру. Вялікай папулярнасцю карыстаюцца яго карціны, шырокую вядомасць заваявалі таксама яго артыкулы і кнігі. І зараз 87-гадовы мастак упэўнена ідзе абраным жыццёвым шляхам. Праўда, жывапіс ён на час адклаў і цалкам аддаўся рабоце над другім томам сваіх мемуараў.

Гэта кніга, як паведаміў Кент журналістам, будзе ахопліваць падзеі апошніх пятнаццаці гадоў. Значыць, у ёй будзе, у прыватнасці, расказана аб дзейнасці Кента на пасадзе старшыні Нацыянальнага савета амерыкана-савецкай дружбы, аб паездках Кента ў Савецкі Саюз, якія, як ён не раз падкрэсліваў, зрабілі на яго вялікае ўражанне.

Тым з большай цікавасцю савецкія чытачы будуць чакаць з'яўлення ў свет новай кнігі Кента.

Э. БАСКАКАЎ,
карэспандэнт ТАСС.

Куток калекцыянера

ФІЛАТЭЛІЯ І ПЛАНЕТА ЗАГАДАК

Венера — самая яркая пасля Сонца і Месяца зорка. Старажытныя астраномы называлі яе «Раніцішняй зоркай» за тое, што яна ўзыходзіць на неба на досвітку, а для беларусаў яна — Мілавіца, зорка кахання. Калі вучоныя пачалі прысвойваць планетам імёны насельнікаў Алімпа, гэтую планету назвалі імем багіні Венеры.

12 лютага 1961 года ў бок таямнічай суседкі была запушчана міжпланетная аўтаматычная станцыя «Венера-1» — першы разведчык загадкавай зоркі.

Сусветная філатэлія адразу ж шырока адгукнулася на выдатны эксперымент савецкай навукі. Міністэрства сувязі СССР выпусціла дзве буйнафарматныя маркі, афарміленыя мастаком М. Левіным. Першая мініяцюра паказвала Зямлю з дакладна вызначанай тэрыторыяй Краіны Саветаў. На фоне зямнога шара — аўтаматычная міжпланетная станцыя. Малюнак акаймаваны тэкстам — дата запуску станцыі і назва трасы «Зямля — Венера». На другой мініяцюры — сама аўтаматычная міжпланетная станцыя «Венера-1», схема палёту.

Запуск першага разведчыка Венеры адлюстравалі ў сваіх філатэлістычных выпусках паштовыя ведамствы Балгарыі, Венгрыі, Чэхаславакіі, Карэі, Кубы.

Прайшло крыху больш за пяць гадоў, і чалавецтва даведалася аб новым старце да Мілавіцы дзвюх аўтаматычных станцый «Венера-2» і «Венера-3». Калі першы разведчык Венеры прайшоў на адлегласці каля 100 тысяч кіламетраў ад яе паверхні, дык «Венера-3» фінішавала на самай паверхні планеты 1-га сакавіка 1966 года. На Венеру быў дастаўлены вымпел з гербам Савецкага Саюза на адным баку, на другім — планеты сонечнай сістэмы і назва краіны, якая ажыццявіла касмічны запуск аўтаматычнай міжпланетнай станцыі.

Гэтыя сімвалічныя рэчы, дастаўленыя на паверхню Венеры, паслужылі мастакам асноўным матэрыялам для стварэння касмічнай маркі. Міністэрства сувязі СССР выпусціла яе ў свет у 1966 годзе ў серыі «Даследчыкі космасу». На мініяцюры ўзноўлены схемы арбіт, па якіх рухаюцца Зямля, Венера і створаная савецкімі вучонымі аўтаматычная міжпланетная станцыя. На фоне трох арбіт мастакі намалявалі дастаўленыя на Венеру вымпел і медаль.

Улетку 1967 года з савецкага касмадрома стартаваў чацвёрты разведчык Венеры. 18 кастрычніка «Венера-4» увайшла ў атмасферу планеты. Якраз у гэты час з'явілася серыя савецкіх паштовых знакаў «Касмічная фантастыка». Аўтары яе — касманаўт А. Ляонаў і мастак-фантаст А. Сакалоў. Адна з мініяцюр серыі была названа «Да невядомых светаў» у барвовых водблісках космасу ляціць ракета, створаная рукамі савецкіх людзей. Пераможны фінал палёту «Венеры-4», які супаў з выпускам гэтай мініяцюры, перакананаўча паказаў, што самая смелая фантазія ператвараецца ў нашай краіне ў рэчаіснасць.

У гэтыя дні гаспадарамі манежа Мінскага цырка сталі артысты з ГДР. Выступленні нямецкіх артыстаў карыстаюцца вялікай папулярнасцю сярод жыхароў сталіцы.

На здымку—дрэсіроўшчык усурыйскіх тыграў Рубі Борн.

Фота С. ГОЛЬДБЕРГА.

НЕВЯДОМЫЯ ШЭДЭЎРЫ

Каля 120 раней невядомых шырокай публіцы твораў сусветнага мастацтва будуць паказаны наведвальнікам Будапешцкага музея прыгожых мастацтваў на выстаўцы «Схаваныя скарбы», якая арганізуецца з выпадку XXII Міжнароднага кангрэсу гісторыі мастацтваў, які адбудзецца ў верасні ў Будапешце. Аб гэтым паведаміў генеральны дырэктар музея Клара Гараш.

Многія з тых твораў, якія будуць прадстаўлены на выстаўцы нядаўна набыты музеем, рэстаўраваны. Аўтары некаторых карцін да гэтага часу невядомыя. Адзін з цікавых твораў выстаўленай калекцыі — карціна італьянскага мастака XVI стагоддзя Ліберале да Верона «Мадонна». Яе доўгі час лічылі згубленай. Таксама лічылі згубленай работу італьянскага мастака XVI стагоддзя «Партрэт Арсіна да Грас». Цікавасць уяўляе нанід меслам буйнейшага фламандскага мастака Рубенса, які ні колі не выстаўляўся. Шырока прадстаўлены палотны Рэмбранта.

В. ФІЛІПАЎ,
карэспандэнт ТАСС.

Будапешт.

У РЭДАКЦЫЮ ГАЗЕТЫ «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Прашу праз Вашу газету перадаць маю шчырую падзяку ўсім арганізацыям, сябрам, таварышам і чытачам, якія павіншавалі мяне з пяцідзесяцігоддзем і ўзнагароджаннем Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Алесь АСІПЕНКА.

ЧЫТАЙЦЕ І ВЫПІСВАЙЦЕ ГАЗЕТУ «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

ДАРАГІЯ ЧЫТАЧЫ!

Пачалася падпіска на газеты і часопісы на 1970 год. Звяртаемся да вас з просьбай: своечасова, не адкладваючы на апошнія тыдні года, падпісвайцеся на газету «Літаратура і мастацтва»!

Газета разлічана на шырокае кола творчай інтэлігенцыі, работнікаў культуры, кінафікацыі, аматараў літаратуры і мастацтва. На старонках газеты вы зможаце прачытаць новыя апавяданні, вершы, урыўкі з раманаў і аповесцей беларускіх пісьменнікаў, рэцэнзіі на кнігі, спектаклі, кінафільмы.

«Літаратура і мастацтва» знаёміць чытачоў з тэатральным, музычным, архітэктурным, культурным жыццём рэспублікі, друкуе выступленні пісьменнікаў, журналістаў, дзеячоў культуры і мастацтва па грамадскіх, прафесіянальных, маральна-этычных праблемах. Шырокае адлюстраванне знаходзяць у газеце пытанні вытворчай эстэтыкі.

Падпіска на газету «Літаратура і мастацтва» прымаецца без абмежавання ў гарадскіх аддзяленнях «Саюздруку», у канторах і аддзяленнях сувязі, а таксама грамадскімі распаўсюджвальнікамі друку.

Газета выходзіць два разы на тыдзень.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

на год	— 4 руб 20 кап.,
на 6 месяцаў	— 2 руб. 10 кап.,
на 3 месяцы	— 1 руб 05 кап.,
на 1 месяц	— 35 кап.

У розніцу газета паступае ў абмежаванай колькасці.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, А. С. ГРАЧАНІКАЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. АТ 18356